WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

6 СТУДЗЕНЯ 2010 г.
СЕРАДА
№ 2
(26610)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Праваслаўным хрысціянам Беларусі

Дарагія суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас з Ражджаством Хрыстовым.

На працягу тысячагоддзяў не цьмянее сіла гэтай вялікай урачыстасці, якая напаўняе сэнсам жыццё людзей, з'яўляецца невычэрпнай крыніцай чалавекалюбства і міласэрнасці.

Ражджаство прыносіць мільёнам вернікаў радасць і надзею на перамогу сапраўднай духоўнасці і гуманізму, ачышчае думкі і пачуцці, заклікае да высакародных учынкаў, спачування і цярпення.

Мы любім і чакаем Ражджаство як самае цудоўнае свята, якое нагадвае аб непарыўнай сувязі пакаленняў, велічы мацярынскай любові, неабходнасці клапаціцца аб сваіх блізкіх. Гэтымі зімовымі днямі з агнямі ўбраных ёлак і боем званоў у сем'ях усталёўваецца атмасфера згоды і ўзаемаразумення, якая сагравае сэрцы ўвесь наступны год. А цудоўная традыцыя дапамогі тым, хто трапіў у цяжкую жыццёвую сітуацыю, набывае новы змест і пабуджае тварыць дабро.

Жадаю вам моцнага здароўя, поспехаў і дабрабыту. Няхай Ражджаство падорыць добры настрой і цяпло дружбы. Няхай дастатак і ўзаемапавага паселяцца ў кожным доме.

Светлага Ражджаства, дарагія сябры!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ВІФЛЕЕМ. СЁННЯ І ЗАЎЖДЫ

«Віфлеем бачыць увесь Сусвет» — гэтую прымаўку я пачуў, калі накіроўваўся па вузенькай вулачцы да цэнтра старажытнага горада. Туды, дзе высіцца базіліка над месцам Нараджэння Хрыстова, ішлі, як кажуць, дзеці розных народаў — людзі рознага колеру скуры, гаворачы на розных мовах, старыя і малыя... Адны — каб учэсціць, іншыя — дзеля цікавасці: усе рушылі да святога месца, якое два тысячагоддзі зіхаціць на нашай планеце самай прыкметнай кропкаю.

Ці гэта Віфлеем глядзіць на ўвесь Сусвет, ці наадварот — дзіўная гульня слоў старой прымаўкі! Між іншым, шматзначная повязь слоў яшчэ больш падкрэслівае ролю гэтага горада ў гісторыі чалавецтва. Нараджэнне тут Збавіцеля не толькі ўславіла горад, але і зрабіла гэтыя мясціны скрыжаваннем шляхоў многіх народаў у часы міру і шматлікіх войнаў.

Галоўная святыня горада — пячора Нараджэння Хрыстова, якая знаходзіцца ў старым храме. Некалькі ўваходаў у храм у даўнія часы заклалі каменнем, і толькі праз адзін (і той паменшаны да мінімальнага памеру!) можна, прыгнуўшыся, увайсці пад скляпенні. Паданне кажа, што так калісьці зрабілі, каб заваёўнікі не мелі магчымасці патрапіць сюды на конях.

Дзве лесвіцы вядуць уніз — там пад алтаром, у святле лампад ззяе срэбная зорка з надпісам: Hic de Virdjine Maria Jesus Christus natus est (Тут ад Дзевы Марыі нарадзіўся Хрыстос). Непадалёк у асобнай пячоры яслі з белага і карычневага мармуру — так пазначана месца, дзе калісьці ляжала немаўля — будучы Збавіцель.

Кажуць, назва горада пайшла ад старых арабскіх слоў «дом хлеба». Гледзячы з адлегласці ў тысячагоддзі — вельмі трапная і сімвалічная аснова для назвы. Гэтым месцам, як хлебам адзіным, злучаны лёсы зямлян. Сёння і заўжды.

Яўген ПЯСЕЦКІ.
Фота аўтара.

«Слава Табе, што паказаў нам Святло!»*

Ражджэственскае пасланне Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі

Узлюбленыя архіпастыры, пастыры, манахі

і ўсе верныя дзеці Беларускай Праваслаўнай Царквы!

У дні Ражджаства Хрыстовага мы з асаблівай яснотай усведамляем, што нараджэнне ў чалавечым свеце Госпада нашага Ісуса Хрыста — гэта свята вялікага асвятлення чалавечага роду Святлом Ісціны.

Чаму ў нашай мове слова «ісціна», як і слова «святло», звычайна не ўжываецца ў множным ліку? Таму што яна не бывае дваістай, бо Ісціна — заўсёды ад Бога. Гэта аб праўдзе кажуць, што яна, маўляў, у кожнага свая. І таму разнадумствы і супярэчнасці раздзіраюць чалавечую супольнасць, нібы старую шату.

У Ражджастве Сына Божага Ісуса Хрыста ажыццявілася шматвяковая мара людзей, якая задоўга да гэтай падзеі была прадказаная ў Псалтыры: «Міласць і ісціна сустрэнуцца, праўда і мір пацалуюцца, — абвяшчае Старазапаветнае Пісанне, — ісціна ўзнікне з зямлі, і праўда прыхіліцца з неба» (Пс. 84: 11—12).

Праўда Божая прыхілілася з неба ў дзень Благавешчання Вечнадзевы Марыі, і Бажэственная Ісціна ўзнікла з зямлі — з Віфлеемскай пячоры, у якой, паводле сведчання Ангела Гасподняга мясцовым пастухам, «нарадзіўся... у горадзе Давідавым Спасіцель, Які ёсць Хрыстос Гасподзь» (Лк. 2: 11).

Упершыню прароцтва пра Святло, якое прыходзіць у свет, запісаў прарок Ісаія, якога нараклі старазапаветным евангелістам: «Народ, які ходзіць у цемры, убачыць святло вялікае; на тых, што жывуць у краіне ценю смяротнага, святло заззяе» (Іс. 9: 2).

І тут прыгадваюцца словы аднаго з псалмоў, якія апісваюць стан некалі паланёнага народа: «Яны сядзелі ў цемры і цені смяротным, скаваныя горам і жалезам; бо не былі пакорнымі словам Божым і не дбалі пра волю Усявышняга» (Пс. 106: 10—11).

Калі мы будзем сумленнымі ў адносінах да самі сябе, то непазбежна зразумеем, што і нашым продкам, і нашым сучаснікам, ды і нам самім знаёмы такі «скаваны» стан душы і розуму, калі забываецца Ісціна, калі выганяецца Бог, калі заглушаецца сумленне, якое ёсць не што іншае, як голас Божы ў душы кожнага чалавека.

Сёння, у дзень святкавання Ражджаства Хрыстовага, давайце нагадаем адзін аднаму пра ісціннае значэнне і змест таго, што мы называем «асветаю».

СТАР. 2

*(Вялікае славаслоўе утрані)

ПІНСКІЯ ЗВЯЗДАРЫ

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

Каляднікі ў вёсцы Валішча Пінскага раёна.

ПЕНСІЯНЕРЫ ЗМОГУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ НА СЁННЯШНІХ УМОВАХ

Адчувальнае зніжэнне тэмпаў росту сярэдніх па краіне заробкаў, зніжэнне рэальнай зарплаты і рэальных пенсій, скарачэнне колькасці вакансій і рэзкае павелічэнне паказчыкаў занятасці ў няпоўным рэжыме — такім быў год мінулы. Сёлета, адзначаюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны, сітуацыя мае змяніцца і перш-наперш — з зарплатамі і пенсіямі. Прычым зноў-такі новы год для сацыяльнай сферы павінен прайсці без «непапулярных» змен.

ПАКУЛЬ — НА 5 ПРАЦЭНТАЎ

Паводле аператыўнай інфармацыі, па стане на 31 снежня ў Беларусі не было пратэрмінаваных даўгоў па выплаце зарплаты. З улікам цяжкасцяў айчыннай эканомікі падобны факт з'яўляецца, безумоўна, прыемным. Аднак сам па сабе малюнак з аплатай працы аказаўся далёка не аптымістычным. Як сведчыць статыстыка, сярэднія па краіне заробкі ў студзені—лістападзе летась выйшлі на адзнаку 989,8 тыс. рублёў. У «намінале» гэта на 12,9 працэнта больш, чым за такі ж перыяд пазалетась. Аднак пры гэтым рэальныя, з улікам інфляцыі, заробкі зменшыліся. Змяншэнне чакаецца і па выніках мінулага года ў цэлым.

Сітуацыю плануецца выправіць сёлета. Як заўважыла **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціна КАРАЛЁВА,** па выніках гэтага года сярэдняя па краіне зарплата павінна выйсці на ўзровень 500 долараў у эквіваленце. Зразумела, што хуткасць змянення заробкаў у рэальным сектары эканомікі — заўсёды пытанне магчымасцяў канкрэтных прадпрыемстваў. Што ж да бюджэтнай сферы, то тут пасля леташняй паўзы запланавана адразу некалькі павышэнняў тарыфнай стаўкі I разраду. Канчатковыя рашэнні будуць прымацца з улікам фінансавых магчымасцяў. Але першы крок ужо зроблены — з 1 студзеня «бюджэтная» тарыфная стаўка I разраду ўзрасла з 77 да 81 тыс. рублёў. З улікам карэкціровачных каэфіцыентаў гэта прывядзе да павелічэння сярэдняй зарплаты работнікаў бюджэтных арганізацый на 5,2 працэнта.

«МІНІМАЛКА» НАБРАЛА ВАГУ

Тым часам, нагадала Валянціна Каралёва, прынятыя рашэнні і наконт сацыяльных гарантый некаторым катэгорыям грамадзян. З 1 студзеня памер штомесячнай дапамогі на дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў узрос да 100 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму, са 120 да 150 працэнтаў БПМ павышана «планка даходаў» пры прызначэнні адраснай сацыяльнай дапамогі, дадзена права на атрыманне без уліку даходаў тэхнічных сродкаў рэабілітацыі інвалідам III групы, а таксама дзецям, якія інвалідамі не з'яўляюцца, але маюць патрэбу ў дапаможных прыстасаваннях паводле медыцынскіх заключэнняў.

Урэшце, павялічыліся гарантыі па аплаце працы. З 1 студзеня месячная «мінімалка» складае 258 600, а пагадзінная — 1530 рублёў.

НЕ ЛАКАЎТ. АЛЕ ПРАСТОЙ

Паводле звестак міністэрства, за студзень—лістапад летась па дапамогу ў працаўладкаванні ў дзяржаўныя службы занятасці звярнуліся 314,9 тыс. грамадзян Беларусі. Тым не менш, дзякуючы стварэнню новых працоўных месцаў, падтрымцы прадпрымальніцтва і перанавучанню беспрацоўных, сітуацыя не выйшла з-пад кантролю. Узровень зарэгістраванага беспрацоўя ў цэлым па краіне адпавядае прыкладна 1 працэнту ад агульнай колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. Пры гэтым не менш адметна, што статыстыка не «зашкаліла» ў рэгіёнах. Па стане на 1 студзеня паказчык беспрацоўя ў 80 гарадах і раёнах не перавышаў 1 працэнта, у 44 гарадах і раёнах — вагаўся ў межах 1,1-1,5 працэнта, у 5 раёнах — у межах ад 1,6 да 2 працэнтаў. І толькі ў Ганцавіцкім раёне ён складаў 2,1 працэнта.

Аднак таксама не сакрэт: стрымліванне афіцыйнага беспрацоўя ў тым ліку стала вынікам свядомай адмовы ад масавых звальненняў. На сёння ў службах занятасці ёсць звесткі аб меркаваным скарачэнні ў лютым ўсяго 146 работнікаў у 4 арганізацыях. Так, не выпадае сумнявацца, што захаванне персаналу з пункту гледжання перспектывы праблемных на сёння суб'ектаў гаспадарання — крок правільны. Аднак стаўка на ўтрыманне штатаў мае і адваротны вынік — вымушаную няпоўную занятасць.

Яе аб'ёмы паступова змяншаюцца. Тым менш аператыўны маніторынг міністэрства засведчыў, што за першыя два тыдні снежня страты працоўнага часу адзначаліся ў 104 з 696 правераных арганізацыяй. Інакш кажучы, праблемы з «загрузкай» былі прыкладна ў кожнага сёмага суб'екта гаспадарання. Што да далейшага развіцця падзей, то прадбачыць іх няцяжка — часткова цяперашняе «схаванае» беспрацоўе можа стаць «адкрытым».

СТАР. 2

Беларуская дэлегацыя накіравалася ў Маскву для прадаўжэння перагавораў па пастаўках нафты ў 2010 годзе

Беларуская дэлегацыя накіравалася ўчора ў Маскву для прадаўжэння перагавораў па ўмовах паставак нафты ў 2010 годзе. Аб гэтым паведаміў прэс-сакратар прэм'ер-міністра Беларусі Аляксандр Цімашэнка.

У складзе дэлегацыі старшыня канцэрна «Белнафтахім» Валерый Казакевіч, намеснік міністра эканомікі Анатоль Філонаў. Яны накіраваліся на перагаворы для канчатковага ўзгаднення пратакола да пагаднення паміж урадамі Беларусі і Расіі ад 12 студзеня 2007 года.

Паводле слоў Аляксандра Цімашэнкі, адпаведныя прапановы Беларусі ўжо накіраваны ў пісьмовым выглядзе расійскаму боку.

Ён падкрэсліў, што ў выпадку ўзгаднення экспертамі канчатковага варыянта пратакола першы намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Уладзімір Сямашка гатовы выехаць у Маскву для падпісання дакументаў.

БЕЛТА.

«Белнафтахім» не плануе павышаць цэны на аўтазапраўках у сувязі з павелічэннем акцызаў на паліва

Канцэрн «Белнафтахім» не плануе павышаць цэны на бензін і дызпаліва на аўтазаправачных станцыях у сувязі з ростам акцызаў на паліва. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе канцэрна, каментуючы павелічэнне ў Беларусі з 1 студзеня ставак акцызаў на бензін і дызпаліва на 9 працэнтаў.

«Цэны на аўтазапраўках засталіся ранейшымі, павышаць іх пакуль не плануецца», — падкрэслілі ў канцэрне. Як праінфармавалі ў Міністэрстве па падатках і зборах, з 1 студзеня стаўкі акцызаў на аўтамабільны бензін з актанавым лікам «95» і вышэйшым павялічаны на 9 працэнтаў да Br1228,3 тыс. за тону, з актанавым лікам ад «91» да «95» — да Br1083,07 тыс., з актанавым лікам да «91» — Br863,88 тыс.

З 1 студзеня на 9 працэнтаў выраслі стаўкі акцызаў на таварнае дызельнае паліва да Br695,74 тыс. за тону, біядызельнае паліва — да Br96,57 тыс., суднавае паліва — да Br695,74 тыс. Стаўка акцызу на звадкаваны вуглевадародны газ, які выкарыстоўваецца ў якасці аўтамабільнага паліва, устаноўлена ў памеры Br227,16 тыс. за тону, на кампрыміраваны паліўны прыродны газ — Br227,16 тыс. за 1 тыс. куб.м.

У дадатку да Асаблівай часткі Падатковага кодэкса, які ўступіў у сілу ў 2010 годзе, вызначаны таксама стаўкі на іншыя падакцызныя тавары: алкагольную прадукцыю, тытунёвыя вырабы, мікрааўтобусы і легкавыя аўтамабілі.

БЕЛТА.

Уследза пісьмом

«НЕ ДЛЯ ТАГО Ж СТОЛЬКІ ВУЧЫЎСЯ, КАБ ВАГОНЫ РАЗГРУЖАЦЬ...»

Падобныя словы не раз даводзілася чуць ад знаёмага, які, скончыўшы БНТУ і атрымаўшы размеркаванне па спецыяльнасці, працягвае, як і ў студэнцкія гады, у вольны час падпрацоўваць грузчыкам. Такія ж сумныя ноткі ўлавіла і ў лісце, а пасля і ў голасе ўрача-стажора Дзімы.

Хірургам малады чалавек марыў стаць з дзяцінства. Шэсць гадоў вучобы ў Віцебскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце за плячыма — і мара так блізка. На стажыроўку адправілі ў Барысаўскую цэнтральную раённую бальніцу. І ўсё б добра, але...

— Многія мае знаёмыя ўжо стварылі сем'і альбо плануюць гэта зрабіць у найбліжэйшы час. Я ж пакуль аб гэтым і думаць баюся. Няма не тое што свайго кутка, але і своечасовага заробку. У працоўным дагаворы чорным па белым прапісана, што найменшы павінен выплачваць зарплату ўрачам-стажорам у 9—11 дзень кожнага месяца. У снежні ж, напрыклад, я (і не толькі) атрымаў зарплату толькі 18-га. Нягледзячы на тое, што аклад складае 348 759 рублёў (сума дзеліцца на аванс і непасрэдна зарплату), грошай чамусьці на стажараў не хапіла... Затрымкі такія бываюць апошнім часам рэгулярна. Скажыце, аб якой дэмаграфічнай палітыцы і бяспецы можа ісці гаворка, калі, пражываючы ў іншым горадзе, іншай вобласці, мы без падтрымкі бацькоў (я ж наогул вымушаны разлічваць толькі на свае сілы, бо маці на пенсіі, а бацькі ў мяне няма) не можам забяспечыць сябе мінімальным наборам тавараў і паслуг для выжывання. Магчыма, людзям, якія маюць кватэры і машыны, і не прынцыпова, сёння ці праз тыдзень яны атрымаюць грошы. Мне ж трэба ў тэрмін заплаціць за камунальныя паслугі. А з такога заробку ні капейкі на «чорны» дзень, калі б і хацеў, не адкладзеш.

Падчас вучобы ў Віцебску Дзіма падпрацоўваў санітарам у бальніцы. Цалкам сябе забяспечваў: здымаў кватэру, харчаваўся, апранаўся. Цяпер жа, хоць і стаў на прыступку вышэй, жыве ад зарплаты да зарплаты, па вушы ў даўгах. Працуе пяць дзён на тыдзень з 8.00 да 16. 00. Тэарэтычна вольны час для падпрацоўкі ёсць. Іншая рэч, будучаму хірургу хацелася б гэта рабіць у сферы медыцыны.

— Не дарэмна ж я столькі гадоў вучыўся... А тут такой магчымасці, на жаль, не даюць. Галоўны ўрач з трыбуны 3 жніўня 2009 года сказаў, што ўсе ахвотныя стажоры будуць працаўладкаваныя на станцыю хуткай дапамогі ў якасці фельчараў. Што датычыцца мяне, то абяцанне так і засталося на словах. Маўляў, няма сярэдняй медыцынскай адукацыі.

— Дзіма, ты, наколькі я зразумела, здымаеш кватэру. Чаму не напісаў заяву на інтэрнат? Усё ж танней абышлося б.

— Усім іншагароднім прапаноўвалі напісаць заяву на інтэрнат. Я, як, у прынцыпе, і большасць стажораў, адмовіўся адразу ж, бо ўмовы пражывання ў інтэрнацэ сумнеўныя. Мяркуйце самі. У пакой, разлічаны максімум на два чалавекі, засялялі не менш за трох, на паверсе функцыянавалі адзін унітаз з чатырох наяўных, адзіная душавая кабіна на пяць паверхаў інтэрната не працавала з-за адсутнасці вады ў летні перыяд, на кухнях не было электрапліт, таму на кожны пакой былі выдадзены старыя электрапліткі (пажарабяспечнасць пад пытаннем), гаворка ўжо не ідзе пра мэблю і рэжым работы інтэрната. Ведаеце, я не люблю скардзіцца. Напісаў у газету ад безвыходнасці, як кажуць, накіпела. Не ўсё ж жыццё ездзіць дадому ў агульным вагоне, бо на плацкарт нестае грошай. Не для таго ж шэсць гадоў вучыўся...

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ФРАНЦУЗСКІЯ «МІРАЖЫ» ПРЫСТУПІЛІ ДА ПАТРУЛЯВАННЯ НЕБА ЛІТВЫ, ЛАТВІІ І ЭСТОНІІ

Чатыры знішчальнікі ВПС Францыі Mirage 2000 прыступілі да патрулявання неба над краінамі Балтыі ў рамках місіі НАТА, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на міністэрства абароны Літвы.

Краіны Балтыі не валодаюць прыдатнымі для паветранага патрулявання самалётамі, таму пасля іх уступлення ў НАТА з красавіка 2004 года ахоўвай паветранай прасторы займаюцца ў парадку ратацыі самалёты краін Паўночнаатлантычнага альянсу, якія базіруюцца на літоўскім аэрадроме Зокняй у 5 кіламетрах ад Шаўляя.

Кантынгент французскіх ВПС у складзе 150 чалавек змяніў нямецкіх калегаў, якія скончылі сваю чатырохмесячную вахту. За час сваёй вахты двойчы нямецкія знішчальнікі суправаджалі самалёты іншых краін, якія здзяйснялі палёты паблізу межаў балтыйскіх дзяржаў.

Французскія вайскоўцы ўжо ў другі раз будуць выконваць місію ў Балтыі. Першы раз яны патрулявалі паветраную прастору над Літвой, Латвіяй і Эстоніяй у 2007 годзе. Летась Альянс прыняў рашэнне аб падаўжэнні патрулявання неба ў краінах Балтыі да канца 2014 года.

УКРАІНСКІМ ВЫБАРАМ ПРАДРАКАЮЦЬ ДРУГІ ТУР: ПАКУЛЬ НАПЕРАДЗЕ ЯНУКОВІЧ



Лідар апазіцыйнай украінскай Партыі рэгіёнаў Віктар Януковіч мае ўсе шанцы набраць найбольшую колькасць галасоў у першым туры прэзідэнцкіх выбараў ва Украіне, які пройдзе 17 студзеня. На другім месцы — прэм'ер-міністр Юлія Цімашэнка, сведчаць апытанні сацыялагічных арганізацый.

Паводле апублікаваных у снежні звестак даследчых цэнтраў ФОМ-Украіна, Інстытута сацыяльнай і палітычнай псіхалогіі, Кіеўскага міжнароднага інстытута сацыялогіі, а таксама Research & Branding Group, якія прыводзіць папулярнае ва Украіне інтэрнэт-выданне «Сегодня.ua», ніхто з прэтэндэнтаў не пераможа ў першай сутычцы, падрыхтоўка да якой праходзіць у шалёнай палітычнай барацьбе.

Цяпер адрыў лідара Партыі рэгіёнаў ад свайго найбліжэйшага канкурэнта — Цімашэнкі — складае ад 15 % да 17 % галасоў. Тым не менш, гэтага не дастаткова для перамогі ў першым туры, паколькі для гэтага ён павінен набраць больш за 50 % галасоў, а максімальны рэйтынг Януковіча, складзены Кіеўскім міжнародным інстытутам сацыялогіі, не перавышае 40%. Што датычыцца другога тура, то тут перавагі сацыёлагаў супадаюць: перамогу можа атрымаць менавіта Януковіч, прычым, па звестках усё таго ж Кіеўскага міжнароднага інстытута сацыялогіі, ён можа набраць 57,3 % галасоў, у той час як Цімашэнка — 39,8 %.

СЕРБІЯ ПАДАЛА Ў ГААГУ ІСК СУПРАЦЬ ХАРВАТЫІ ЗА ГЕНАЦЫД

Сербія падала іск супраць Харватыі ў Міжнародны суд у Гаазе па абвінавачваннях у генацыдзе ў дачыненні да сербаў падчас узброенага этнічнага канфлікту на тэрыторыі Харватыі з 1991 па 1995 гады.

У аб'ёмным дакументе, які будзе пададзены ў суд, сабраныя доказы генацыду сербскага насельніцтва харвацкімі ўладамі і вайскоўцамі ў першай палове 1990-х. Гаворка ідзе ў першую чаргу аб аперацыі «Бура», якую правяла ў 1995 годзе армія Харватыі пры падтрымцы Босніі і Герцагавіны.

Вынікам ваенных дзеянняў стала ліквідацыя самаабвешчанай Сербскай Краіны. Акрамя таго, паводле звестак Белграда, больш за 250 тысяч сербаў сталі бежанцамі, больш за 600 мірных жыхароў загінулі. Як сцвярджае Сербія, сама аперацыя стала актам генацыду. Акрамя таго, ужо пасля завяршэння баявых дзеянняў былі забітыя многія сербы, якія спрабавалі вярнуцца ў свае хаты.

У ЗША ПАМЕРЛА 30-ГАДОВАЯ СПАДЧЫННІЦА JOHNSON & JOHNSON

Спадчынніца фармацэўтычнай імперыі Johnson & Johnson Кейсі Джонсан раптоўна сканала ва ўзросце 30 гадоў, паведаміў тэлеканал CNN.

Джонсан памерла ў сваёй хаце ў Лос-Анджэлесе, прычына смерці ўдакладняецца.

«Гэта падобна на натуральную смерць. Ніякіх сведчанняў забойства не выяўлена. Справаздача аб выніках таксікалагічнага абследавання хутка будзе», — цытуе тэлеканал прадстаўніцу паліцыі Сару Фейдэн.

Прапраўнучка заснавальніка Johnson & Johnson Кейсі Джонсан у СМІ была вядомая, у першую чаргу, скандальнымі выхадкамі, звязанымі з былымі сяброўкамі. У апошні час, аднак, яна зрабіла прапанову Ціле Тэкіле, падарыўшы ёй пярсцёнак з 17-каратным дыяментам.

Ну і ну!

ТАКСАФОН НА ПАМЯЦЬ

прыхапіў невядомы грамадзянін. Ён зняў апарат для тэлефоннай сувязі «Агат 071» разам з кабінкай ля дома па праспекце Касманаўтаў у Гомелі. Кошт выкрадзенага складае больш чым 750 тысяч рублёў. Можа, дома ўсталюе, можа, на каштоўныя металы здасць...

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

В извещение о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды зданий (сроком на 3 года), расположенных по адресу: Минский район, дер. Б. Тростенец, опубликованном в газете «Звязда» от 30.12.09, **вносится изменение:**

«Начальная цена права аренды с НДС – 14 836 099 бел. рублей. Ставка арендной платы за 1 кв.м – 4 евро».

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.
Сайт в интернете: www.rlt.by

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.01.2010 г. (для б/н разлікаў)

▲1 долар ЗША	2 859,00
▲1 еўра	4 112,68
1 латвійскі лат	5 816,30
1 літоўскі літ	1 194,76
1 чэшская крона	157,20
1 польскі злоты	1013,54
▼1 расійскі рубель	94,72
1 украінская грыўня	357,24

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	30,1851
UAH	37,4970
1000 BYR	10,5395
EUR	43,4605

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2010 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Калядны аматарскі турнір адыграў немалую ролю ў атрыманні Беларуссю права прыняць чэмпіянат свету па хакеі-2014

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, адкрываючы ў мінскім Палацы спорту 6-ы Калядны міжнародны турнір аматараў хакея на прыз Прэзідэнта Беларусі, адзначыў, што гэта традыцыйнае спаборніцтва адыграла немалую ролю ў тым, што Беларусь атрымала права на правядзенне чэмпіянату свету па хакеі 2014 года.

«Па ўзросце гэта свята здароўя і прыгажосці яшчэ зусім юнае, яму ўсяго толькі 6 гадоў, але яно стала ўжо добрай традыцыяй, набыло папулярнасць як у нашай краіне, так і за яе межамі. Кожны год напярэдадні Калядаў у беларускую сталіцу з розных куткоў планеты з'язджаюцца сапраўдныя паклоннікі адной з самых любімых, масавых і азартных гульняў — яго вялікасці хакея. Думаю, што турнір адыграў немалаважную ролю ў тым, што Беларусь выйграла права на правядзенне чэмпіянату свету па хакеі ў 2014 годзе», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што ў складах каманд-удзельніц нямала спартсменаў, якія бліскуча выступалі на спаборніцтвах самага высокага ўзроўню і змогуць парадаваць балельшчыкаў дастойнай гульнёй.

Звяртаючыся да гасцей турніру, кіраўнік дзяржавы сказаў, што ў гэтыя святочныя дні ў іх будзе магчымасць азнаёміцца з нашай цудоўнай краінай і пераканацца ў гасціннасці і добразычлівасці беларускага народа. «Мы ганарымся, што Беларусь лічаць спартыўнай дзяржавай. Імкнёмся да таго, каб для кожнага спорт стаў ладам жыцця. Спорт у Беларусі — адзін з дзяржаўных прыярытэтаў. Дзяржава робіць і будзе рабіць усё магчымае для яго развіцця», — адзначыў ён. «Зусім нядаўна быў пабудаваны лядовы спартыўны комплекс у Баранавічах, толькі што завершана будаўніцтва грандыёзнага спарткомплексу «Мінск-Арэна». Таму калі ў балельшчыкаў будзе вельмі вялікае жаданне прыйсці на фінальны матч, то мы не выключаем, што ён можа адбыцца на новай пляцоўцы «Мінск-Арэны», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што на працягу чатырох бліжэйшых дзён гледачы ўбачаць хакей найвышэйшага класа і атрымаюць шмат станоўчых эмоцый. На яго думку, адной з асаблівасцяў Каляднага турніру з'яўляецца тое, што ў ім няма прайграўшых, «тут выйграюць усе».

Вынікі першых паядынкаў турніру: Украіна абыграла Славакію — 7:6, а каманда Расіі ўзяла верх над Фінляндыяй — 11:6. Беларусь на турніры прадстаўлена камандай Прэзідэнта краіны. У першым матчы яна з буйным лікам абыграла каманду Швейцарыі — 10:3.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

ПЕНСІЯНЕРЫ ЗМОГУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прагназуецца, што сёлета яго афіцыйны паказчык у Беларусі крыху ўзрасце і выйдзе на 1,1-1,2 працэнта. У сувязі з гэтым набывае асаблівую актуальнасць яшчэ адна праблема — падтрымкі грамадзян, якія зарэгістраваліся ў службе занятасці.

Пакуль памер дапамогі па беспрацоўі ў Беларусі — адзін з найбольш нізкіх у СНД. Таму, як паведаміла Валянціна Каралёва, вывучаецца магчымасць павелічэння як дапамогі па беспрацоўі, так і стыпендый асобам, якія праходзяць перанавучанне па накіраваннях службы занятасці. У прыватнасці, гэтыя выплаты прапануецца «прывязваць» не да базавай велічыні, а да бюджэту пражыткоўка мінімуму.

ПЕНСІЙНЫ ЎЗРОСТ ЗАСТАНЕЦЦА РАНЕЙШЫМ

Традыцыйна няпростая тэма — пенсіі. На працягу мінулага года ў сувязі з ростам бюджэту пражыткоўка мінімуму мінімальныя, сацыяльныя пенсіі, а таксама надбаўкі і павышэнні індэксаваліся 4 разы, пераразлік працоўных пенсій быў праведзены аднойчы — з 1 лістапада. Такім чынам, у цэлым летась сярэднямесячны памер пенсіі па ўзросце павялічыўся на 8,8 працэнта і склаў 415,9 тыс. рублёў, а сярэднямесячны памер мінімальнай пенсіі па ўзросце павысіўся на 11 працэнтаў — да 235,6 тыс. рублёў. Пры гэтым суадносіны мінімальнай пенсіі па ўзросце і бюджэту пражыткоўка мінімуму пенсіянера адпавядалі 109,5 працэнта. Між тым наступны пераразлік пенсій зроблены ўжо сёлета — з 1 студзеня сярэдні памер усіх працоўных пенсій узрос на 9 працэнтаў. У цэлым жа па выніках года ў міністэрстве прагназуюць намінальную прыбаўку па пенсіях па ўзросце на 18—20 працэнтаў. Іх сярэдні памер павінен выйсці на аднэак 492—507 тыс. рублёў.

Прычым Валянціна Каралёва падкрэсліла: чакаць у новым годзе павышэння пенсійнага ўзросту не варта. Не зменяцца і ўмовы выплат працуючым пенсіянерам.

ВЕТЭРАНАМ — ВЫПЛАТЫ ДА СВЯТА

Адна з адметных падзей новага года — 65-гадовы юбілей Перамогі. Па стане на 1 кастрычніка ў Беларусі пражывалі 45 749 ветэранаў і больш 50 тысяч грамадзян, якія пацярпелі ад наступстваў Вялікай Айчыннай вайны. На жаль, колькасць ветэранаў Вялікай Айчыннай хутка змяншаецца — усяго пяць гадоў таму іх было ў два разы больш.

Як заўважыла Валянціна Каралёва, сёння кожны шосты ветэран вайны з'яўляецца адзінокім чалавекам, а кожны трэці — пражывае ў вёсцы. Адсюль асаблівая патрэба ў сацыяльнай падтрымцы. Сёлета пройдзе абследаванне ўмоў жыцця кожнага ветэрана — на падставе гэтага будуць распрацаваны планы аказання неабходнай дапамогі. Як правіла, маецца на ўвазе рамонт жылля, гаспадарчых пабудоў і печак, замена электраправодкі, апрацоўка прысядзібных участкаў, нарыхтоўка паліва, бульбы і агародніны на зіму. Адначасова ветэранам плануецца аказаць аднаразовую матэрыяльную дапамогу. На гэтыя мэты ў бюджэце краіны запланавана 17,3 млрд рублёў.

Сяргей ГРЫБ.

«ПАДАРУНАК» ДА СВЯТА НАРАДЖЭННЯ ХРЫСТОВАГА...

5 студзеня каля 6 гадзін раніцы на могілках ля вёскі Стары Крыўск Рагачоўскага раёна загарэлася маленькая царква, пабудаваная ў гонар святога Міколы ў 1815 годзе.

Зусім нядаўна тут зрабілі рамонт. Будынак, складзены з бярвення, які выкарыстоўваўся толькі зрэдку, хутка ахапіла полымя. У тушэнні пажару ўдзельнічала 6 адзінак тэхнікі, але справа ўскладнялася тым, што ў найбліжэйшым гідранце не было ціску, каб набраць ваду, а ў вадаёмах уся вадкасць ператварылася ў лёд. Таму ваду дастаўлялі з Доўска, што за 6 кіламетраў ад месца ўзгарання.

Вядома, што менавіта ў гэтай царкве знаходзілася шмат рэчаў, зробленых рукамі святой Манефы Гомельскай, не так даўно кананізаванай Беларускай праваслаўнай царквой. Сутнасць у тым, што ў 60-я гады гэты маленькі храм заставаўся амаль што адзіным незакрытым у гэтых мясцінах і праваслаўныя вернікі прыязджалі маліцца з розных куткоў Беларусі. Сюды ж, у Стары Крыўск, на нядзельныя і святочныя службы прывозілі і бездапаможную матухну Манефу. У царкве заўсёды паказвалі месца, дзе звычайна стаяў самаробны вазок схіманашкі. Там жа захоўваліся ручнікі для абразоў, якія яна вышывала сваімі рукамі. Усе яны, як і іншае гістарычнае начыннe царквы, дасталіся полымю.

Як паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях, знойдзены два пачатковыя ачагі пажару: агонь усчаўся на дашчатай верандзе, у якой было разбітае шкло. Можна зрабіць меркаванне, што ў гэтым выпадку не абышлося без наўмыснага намеру знішчыць культавую гістарычную пабудову. Так гэта ці не — пакажа следства.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ТЕХНОБАНК»!

Настоящим извещаем о проведении внеочередного Общего собрания акционеров ОАО «Технобанк» **в очной форме.**

Дата проведения: 15 января 2010 года.

Место проведения (адрес): г. Минск, ул. Кропоткина, 44, ОАО «Технобанк», II этаж.

Регистрация участников общества для участия в собрании: с 10.00 до 11.00 по месту проведения собрания.

Время проведения заседания: с 11.00 до 13.00.

Повестка дня Общего собрания акционеров:

1. О реорганизации ОАО «Технобанк».
2. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи.
3. О выкупе ОАО «Технобанк» акций собственного выпуска по требованию акционеров ОАО «Технобанк».
4. Об избрании членов Совета Директоров ОАО «Технобанк».

Для регистрации с собой необходимо иметь: паспорт (для физических лиц), документ, подтверждающий полномочия руководителя, и печать (для юридических лиц)!!!

Для получения дополнительной информации обращаться в ОАО «Технобанк» по адресу:
г. Минск, ул. Кропоткина, 44, телефон (017) 237 43 80.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 11 от 27.10.2006 г., УНП 100706562.

«Слава Табе, што паказаў нам Святло!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Навучаючы нашых дзяцей асновам навук і павышаючы ўзровень сваіх ведаў, мы добра робім. Але калі мы не дбаем пра сумленне і пра такія асноватворныя каштоўнасці сусветнай цывілізацыі, як любоў да Бога і любоў да бліжняга, — мы далёкія ад ісціннага разумення таго, што ёсць адукаваны чалавек.

Цэлая эпоха ў гісторыі еўрапейскай культуры была названа «эпохай Асветніцтва». Але гэта быў таксама і час саманадзейнага і спакуслівага адмаўлення вучонага розуму ад Бажэственнай Ісціны, час ганенняў, узнятых супраць Госпада Ісуса Хрыста, супраць Евангелля любові і супраць Божага Закона жыцця.

Менавіта тады веды і розум пачалі супрацьпастаўляць веры і сэрцу, нібы яны — непрымірымыя ворагі. І што ж спарадзіла гэтая ганарлівая эпоха? Не, не росквіт народаў, не мір і не дабрабыт. Яна выклікала да жыцця такія грамадзянскія смуты і кровапраліцці, такія войны і гістарычныя катастрофы, якія дагэтуль адгукаюцца злавесным рэхам у розуме людскім.

Страшны вопыт перажывае чалавек, назапасіўшы многія веды, валодаючы прагрэсіўнымі поглядамі і шырокімі практычнымі навыкамі, — але не асветлены святлом Бажэственнай Ісціны. Раней ці пазней ён усведамляе, што ён не свабодны, што ён скаваны адзінотай і безвыходнасцю, што ён пакрыты ценем забыцця, і навокал — пустэча...

Да самых глыбінных сховаў чалавечага сэрца звернута евангельскае пытанне Хрыста Збаўцы: «Дык вось, калі святло, якое ў табе, — цемра, тады якая ж сама цемра?» (Мф. 6: 23). І калі чалавек паспрабуе сумленна адказаць свайму Творцу і самому сабе на гэтае пытанне, то ён абавязкова пажадае сапраўднай, паўнавартаснай, ісціннай асветы.

Дык з чаго ж яна складаецца — асвета чалавека, нацыі, усяго чалавечага роду? Яна складаецца з таго, каб «даць зразумець народу... спасенне ў прабачэнні грахоў»; у тым, каб «асвятліць тых, што сядзяць у цемры і цені смерці, скіраваць ногі... на шлях міру» (Лк. 1: 76—80).

Гэтае азначэнне належыць свяшчэнніку Захарыі, які прамовіў яго над сваім нованароджаным сынам Іаанам — будучым Прарокам, Прадцечам і Хрысціцелем Госпадні. І калі прайшло шэсць месяцаў пасля прамаўлення гэтых слоў, тады зімовай ноччу ў горадзе Давідавым, у пячоры для авечага статку, Тварэц асвятліў свет Ражджаством Сына Божага — Сына Чалавечага, Богадзіцяці Ісуса.

І з той пары, паводле слова апостала і евангеліста Матфея, які сведчыць пра здзяйсненне старажытных прароцтваў, «народ, што сядзіць у цемры, убачыў святло вялікае, і ўсім, хто сядзіць у краіне і цені смерці, заззяла святло» (Мф. 4: 14—16).

Узлюбленыя браты і сёстры! Мы шмат разважаем і гаворым пра тое, як правільна выхаваць разумных і добрых дзяцей, як лепш укласці ў малады розум патрэбныя і карысныя веды. І калі гэтая задача больш-менш вырашаная, нас асабліва хвалюе праблема таго, каб усе гэтыя назапашаныя скарбы не сталі для іх цяжарам, мёртвым у сваёй бясплоднасці.

І тут хрысціяне пакліканы нагадаць сваім словам і справай, сваёю працаю і ўсім жыццём сваім, што толькі ў Святле Бажэственнай Хрыстовай Ісціны пасеяныя зярняты сагрэюцца, і прарастуць, і распусцяць лісце, якое ўсцешыць сэрца, і прынясуць добрыя плады.

«Святло Хрыстова асвятляе ўсіх»! Менавіта хрысціяне ў гэтым свеце пакліканыя быць светачамі, каб асвятляць шлях ісціны і жыцця Святлом Хрыста Спасіцеля.

Так, разважаючы пра падзеі больш як двухтысячагадовай даўніны, мы думаем пра сябе, пра сучаснае грамадства, пра нашую асабістую і агульную гісторыю. І сёння, калі мы ўступілі ў новы год грамадзянскага летаслічэння, мы з радасцю пераконваемся, што шматвекавы летапіс нашага гістарычнага быцця не перарваўся. Ён бачна прысутнічае ў цяперашнім часе, і мы працягваем яго напісанне — тут і цяпер.

Сёлета спаўняецца 100 гадоў з дня перанясення з Кіева ў Полацк мошчаў святой апякункі Белай Русі прападобнай маці нашай Ефрасінні. Прыгадаем, што гэтай гадавіне на працягу двух дзесяцігоддзяў папярэднічала адраджэнне самой Полацкай абіцелі, аднаўленне духоўнага сімвала беларускай зямлі — Крыжа прападобнай Ефрасінні, выраб сярэбранай ракі для яе святых мошчаў, адкрыццё фрэсак у храме XII стагоддзя, перад якімі Прападобная праводзіла ў малітве да Бога сваё жыццё, і, нарэшце, добраўпарадкаванне і росквіт самога горада Полацка.

У наш час усё гэта і шмат чаго іншага з'яўляецца працягам той асветніцкай дзейнасці, якую князёўна-ігумення пачала восем стагоддзяў таму. І гэтая місія неад'емная ад Святой Царквы, якая пакліканa ўсімі сіламі трымацца запавету свайго Заснавальніка і Галавы Госпада Ісуса Хрыста: «Дык няхай свеціць святло ваша перад людзьмі, каб яны бачылі вашы добрыя ўчынкі і праслаўлялі Айца вашага Нябеснага» (Мф. 5: 16).

Замыкаючы ланцужок гістарычных падзей не толькі XX стагоддзя, але ўсіх васьмі стагоддзяў, што прайшлі з часу зямнога служэння прападобнай Ефрасінні, нам належыць здзейсніць успамін яе вялікага шэсця з Кіева ў Полацк, якое асвяціла землі братніх народаў напярэдадні іх вогненных выпрабаванняў.

Вяртаючы ў наша сучаснае жыццё людскія імёны і дзеянні мінулых дзён, мы аддаём нашым продкам і папярэднікам даніну ўдзячнай памяці. І разам з тым мы прымаем на сябе паўнату духоўнай адказнасці за цяперашнія і будучыя часы. Таму надыходнае святкаванне 100-годдзя вяртання прападобнай Ефрасінні ў Полацк звернута не толькі ў мінулае, але, перш за ўсё, — у будучыню нашых маладых і юных пакаленняў, у Жыццё Вечнае, дзе «ўсё і ва ўсім Хрыстос» (Кол. 3: 11).

Вось чаму сёння, у дні святкавання Ражджаства Хрыстовага, мы адзінымі вуснамі і адзіным сэрцам паўтараем словы старажытнага Псалтыра, скіраваныя да Збаўцы, Які прыходзіць у свет: «У Цябе крыніца жыцця; у святле Тваім мы ўбачым святло» (Пс. 35: 10). Амінь.

ФІЛАРЭТ,
Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі,
Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі

Ражджаство Хрыстова, 2009/2010 г., Мінск

САМЫ ДАРАГІ ГАНДБАЛІСТ СВЕТУ З ЛЮТАГА ЗМОЖА ВЫСТУПАЦЬ ЗА ЗБОРНУЮ БЕЛАРУСІ

Сяргей Рутэнка правёў першы збор у нацыянальнай камандзе

Беларус Сяргей Рутэнка, які летась заключыў самы дарагі ў гісторыі сусветнага гандбола кантракт з іспанскай «Барселонай» (сума яго трансферу — 1 мільён еўра) з лютага зможа ўдзельнічаць у матчах за нацыянальную каманду. Нагадаем, што з 2000-га года гандбаліст выступаў за зборную Славеніі, затым меў запрашэнне ад зборнай Іспаніі. Але з 2007 года кіраўніцтва Беларускай федэрацыі гандбола зрабіла неабходныя захады для таго, каб знакаміты гандбаліст абараняў колеры беларускага сцяга. І менавіта ў лютым скончыцца так званы каранцін, будуць канчаткова аформленыя ўсе паперы і Рутэнка зноў зможа дапамагчы нашай камандзе.

Як расказаў сам гандбаліст, меркавалася, што гэтай радаснай навіной ён зможа падзяліцца адразу пасля Новага года, але працэс зацягнуўся. Хоць яго дапамога камандзе менавіта ў студзені была б вельмі дарэчы — з 15 па 17 студзеня наша дружына пазмагаецца ў кваліфікацыйным турніры на Кіпры, па выніках якога лепшая каманда выйдзе ў плэй-оф чэмпіянату свету 2011. Супернікамі беларусаў, акрамя гаспадароў, стануць каманды Швейцарыі і Фарэрскіх астравоў. Перад беларускай дружынай стаіць задача заняць першае месца на гэтым турніры і далей змагацца за выхад на чэмпіянат свету. Як заверыў намеснік старшыні федэрацыі гандбола Іван Семяненя, каманда гатовая да гэтых выступленняў, нягледзячы на няпростую сітуацыю, у якой апынулася. Чацвёра гульцоў асноўнага складу атрымалі траўмы і выступіць не змогуць. Акрамя таго, лідар зборнай і гулец нямецкага клуба «Райн Левен» Сяргей Гарбок на днях даслаў у федэрацыю тэлеграму, дзе паведамляе, што спыняе ўдзел у матчах зборнай «па асабістых абставінах». І спадзяецца, што гэты перапынак будзе мець часовы характар. Нагадаем, што Сяргей Гарбок мае дочак-трайнят, якім нядаўна споўніўся годзік.

На гэта спадзяюцца і ў федэрацыі, пра што паведаміў Іван Семяненя. Ён расказаў, што старшыня федэрацыі гандбола Уладзімір Канаплёў адразу пасля атрымання гэтай навіны меў тэлефонную размову з гандбалістам. У прыватнасці, паводле слоў Івана Семянені, гульцу прапануюцца шэраг варыянтаў, пры якіх ён зможа выступаць за нашу каманду. «Мы ледзь не няньку яму прапаноўвалі. Быў варыянт, калі сям'я будзе разам з Сяргеем на зборах. Але пакуль ён сказаў, што сам хоча дапамагаць жонцы выхоўваць дзяцей», — расказаў намеснік старшыні федэрацыі. Іван Семяненя ўсё ж спадзяецца, што гандбаліст зменіць сваё рашэнне і 14 студзеня, калі каманда возьме курс на Кіпр, Сяргей Гарбок будзе разам з ёй.

Сяргей Рутэнка, які гэтыя дні правёў у стане нацыянальнай зборнай, расказаў, чаму выраshыў выступаць за Беларусь і адмовіў зборнай Іспаніі, чым жыве беларуская дружына і якія ў яе шанцы на выхад у топ-турнір.

— Сяргей, у вас былі прапановы выступаць за зборную Іспаніі, каманду, з якой па сілах выйграць любы турнір і трафей. Але вы зрабілі выбар на карысць Беларусі, дзе ў камандзе з лідараў — вы адзін...

— Я не адзін, ёсць яшчэ 16 гульцоў... Калі я цяпер быў на зборы ў Стайках, маё ўнутранае самадчуванне можна назваць ідыліяй. У жыцці важныя не толькі трафеі, але і ўласны псіхалагічны камфорт. Зразумела, нам будзе цяжка, бо задачы стаяць вельмі высокія. Але тым цікавей выступаць і тым больш салодкай будзе перамога, на якую мы ўсе спадзяёмся. Таму аб прынятым рашэнні ніколькі не шкадаваў, як і аб тым, што адмовіўся выступаць за Іспанію. Я не маю намеру проста прыехаць у зборную, адыграць і забыць. У мяне надзвычайная матывацыя.

— Якія аргументы знайшла федэрацыя, каб вы ў 2007 прынялі рашэнне прайсці ўсе гэтыя працэдуры і вярнуцца ў беларускую каманду?

— Іх было некалькі. Галоўны — маё жаданне вярнуцца дадому. І мне прыемна бачыць, што цяпер вядзецца вялікая праца па аднаўленні гандбола. І ёсць сістэма, ты ведаеш, хто за што адказвае і дзе што знаходзіцца...

— Маеце на ўвазе кіраўніка федэрацыі Уладзіміра Канаплёва?

— Так, яму складана сказаць «не».

— Вы казалі пра жаданне вярнуцца дадому. Сваё жыццё пасля завяршэння спартыўнай кар'еры звязваеце з Мінскам?

— На сёння — так, хоць складана сказаць, праз які тэрмін гэта будзе.

— Праз колькі гадоў наша каманда зможа змагацца за прызавыя месцы на топ-турнірах?

— Было страчана некалькі пакаленняў малайдых гульцоў, некалькі ўзростаў проста выпала. І на аднаўленне гэтага прабелу патрэбны час. Як мінімум тры-чатыры ўзросты патрэбны, якія з часам будуць запрошаныя ў нацыянальную каманду. Зразумела, спатрэбіцца нямала часу.



Фота БЕЛТА.

— Грашовая праблема для гульцоў нацыянальнай каманды існуе?

— Фінансавы бок немалаважны. Але не сакрэт, што сёння гульцы, якія выступаюць за нацыянальную каманду, атрымліваюць істотную матэрыяльную падтрымку, якая дае магчымасць разумець, што твая сям'я абароненая, і аддавацца гандболу.

— Увогуле ўмовы ў сённяшняй зборнай вас як гульца сусветнага ўзроўню задавальняюць?

— На мой погляд, цяпер створаны ўсе ўмовы для трэніровак і росту гульцоў. І шмат у чым дзякуючы гэтаму, я камфортна адчуваў сябе цяпер на зборах.

— Да футбалістаў, якія на матчы нацыянальнай зборнай лятаюць у Брэст на самалёце, гандбалістам, напэўна, яшчэ далекавата...

— Калі і нашы гульцы будуць лятаць на матчы на самалёце, яны не засмуцяцца. Але ўсе мы разумеем, што футбол і гандбол — вельмі розныя віды спорту. На вялікі жаль. Тут не трэба праводзіць паралеляў. Але калі наш гандбол будзе развівацца тымі тэмпамі, якія ўзятыя цяпер, гэта будзе вялікі плюс.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ДЛЯ ХЛОПЦА ГОД ТАК І НЕ ПАЧАЎСЯ...

На зернясховішчы СВК «Дружба-Аўцюкі» ў Калінкавіцкім раёне знойдзены труп няпоўнагадовага, які, магчыма, замёрз у навагоднюю ноч.

Пакуль не праведзена экспертыза, супрацоўнікі пракуратуры ўстрымліваюцца ад каментарыяў наконт дакладных прычын смерці 16-гадовага юнака. Як паведаміў пракурор аддзела пракуратуры Гомельскай вобласці Сяргей Канапліцкі, цяпер вядома, што сваякі маладога чалавека пачалі шукаць яго яшчэ напярэдадні, аб чым падалі заяву ў мясцовы РАУС. Рабочы СВК, які расчышчаў снег на тэрыторыі СВК «Дружба-Аўцюкі», знайшоў скарчанелы труп хлопца...

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Стыхія

СНЕГ, ДОЖДЖ І МАРАЗЫ!

На гэтым тыдні нашу краіну чакаюць вельмі складаныя ўмовы надвор'я, паведаміў журналістам начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.

МОЦНЫ СНЕГ І ГАЛАЛЁД

Ужо сёння ўдзень праз цэнтральныя рэгіёны краіны да нас завітае паўднёвы цыклон, які істотна сапсуе надвор'е. Таму паўсюдна будзе ісці снег, месцамі моцныя снегапады. Чакаюцца заносы, на дарогах галаледзіца, парывісты вецер. Маразы будуць толькі ў межах 1—8 градусаў. На жаль, складанае надвор'е захаваецца ў ноч на Каляды. Будзе ісці снег, месцамі моцны, мяцеліца, на дарогах заносы, моцны вецер. Ад 0 да 7 марозу. Удзень 7 студзеня надвор'е пачне паляпшацца. Снег стане не такі моцны, пачне сціхаць вецер. Ад мінус 4 да плюс 2. Галаледзіца. У пятніцу ўначы падмарозіць да мінус 4—11 градусаў. Аднак ужо ў суботу да нас завітае новы цыклон з боку Украіны, які прынясе вельмі цёплае паветра. Амаль паўсюдна дождж і мокры снег. Галаледзіца, моцны вецер. Аад мінус 3 да плюс 3.

МАРАЗЫ ДА МІНУС 25

Такое рэзкае пацяпленне працягнецца толькі некалькі дзён. Ужо з пачатку наступнага тыдня маразы ў паўночных рэгіёнах будуць дасягаць 18—25 градусаў. Аднак і гэта пахаладанне будзе нядоўгім. У апошнія дні другой дэкады студзеня да нас зноў завітаюць вільготныя мяккія цыклоны. Між іншым, рэзкія тэмпературныя перапады на гэтым не скончацца. Сіноптыкі прагназуюць, што прыкладна 25—26 студзеня ў нас зноў будуць сур'ёзныя маразы.

ЗВЫЧАЙНЫ СТУДЗЕНЬ, ВІЛЬГОТНЫ ЛЮТЫ

Увогуле сярэднямесячная тэмпература студзеня чакаецца каля кліматычнай нормы, якая складае 5—8 марозу. Недзе ў норме чакаюцца і ападкі, якіх павінна быць каля 32—46 мм. Сярэдняя тэмпература ў лютым прагназуецца на ўзроўні мінулых гадоў — ад мінус 3,5 на поўдні да 8 марозу на паўночным усходзе. Аднак люты сёлета можа стаць даволі багатым на ападкі, якіх павінна выпасці значна больш за кліматычную норму (35—65 мм).

УВЕСНУ ЧАКАЕМ МОЦНУЮ ПАВОДКУ?

У апошні месяц мінулага года ў нашай краіне выпала даволі вялікая колькасць ападкаў. Па стане на 31 снежня вышыня снежнага покрыва дасягае месцамі 30—35 сантыметраў. Начальнік аддзела гідралагічных прагнозаў Марына Нагібіна адзначыла, што цяпер на такіх рэках, як Дняпро, Сож, Прыпяць, Заходняя Дзвіна і Бярэзіна назіраецца павышаная воднасць, якая перавышае звычайную норму на гэты час у 2—3, а часам і ў 3,5 раза. Сёлета ўвесну нашу краіну чакае даволі моцная паводка. Апраўдвальнасць сутачных прагнозаў склала 96,2 працэнта, трохдзённых прагнозаў — 94,3 працэнта, прагнозу экстрэмальных з'яў — 96,5 працэнта.

Сяргей КУРКАЧ.

У сувязі са святамі наступны нумар "Звязды" выйдзе 12 студзеня.

ЗА ФЕЕРВЕРК ЗАПЛАЦІЎ ВОКАМ

Для 35-гадовага мінчаніна святкаванне Новага года завяршылася сумна: ён страціў 50 працэнтаў зроку ў выніку выбуху петарды.

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, здарэнне адбылося 1 студзеня ў Савецкім раёне сталіцы, дзе кампанія ў адной з устаноў адзначала надыход 2010 года. Свята было вырашана ўпрыгожыць з дапамогай піратэхнікі, а пацярпелы якраз і знаходзіўся ў кампаніі маладых людзей, што выйшлі на вуліцу паглядзець на салют. Між іншым, паводле першапачатковай праверкі, ён разам з іншымі і ставіў тыя петарды, ад якіх пасля і здарыліся непрыемнасці. І хоць людзі адышлі, здавалася б, на бяспечную адлегласць, выбух «знайшоў» сваю ахвяру: удар прыйшоўся ў вока пацярпеламу. Насамрэч, падкрэсліваюць сталічныя праваахоўнікі, цяжка спрагназаваць траекторыю палёту разраду, тым больш, калі феерверк робяць не спецыялісты, якія да таго ж выкарыстоўваюць піратэхніку, набытую з-пад крыса. Што датычыцца пацярпелага, то ён быў дастаўлены ў бальніцу, дзе пасля аперацыі ўрачы вынеслі несуцяшальны дыягназ: кантузія 4 ступені, размазджэрванне яблыка вока, тэрмічны апёк кан'юктывы, апёкі скуры 1-2 ступені...

Ігар ГРЫШЫН.

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
(организатор аукциона) 21 января 2010 года повторно
ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
по продаже единым лотом принадлежащих ОАО «Минское производственное кожевенное объединение» Минский район (продавец) зданий, сооружений и иного имущества, расположенного по адресу: Минская область, Минский район, район поселка Гатово.
В состав лота входит следующее имущество:

№ п/п	Наименование и характеристики продаваемого имущества
1.	Здание производственного корпуса общей площадью 8 957,0 кв. м, инв. номер 600/С-118240
2.	Склад ОКСа (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ площадью 430,9 кв. м, инв. номер 600/С-104462)
3.	Контрольно-пропускной пункт № 3 (здание неустановленного назначения площадью 6,9 кв. м, инв. номер 600/С-104457)
4.	Подъездные автодороги (асфальт) – 8470 кв. м
5.	Металлосетчатый забор (прямоугольные рамные конструкции из проволочной сетки на металлических опорах) – 374,0 м
6.	Железобетонный забор (железобетонные панели на железобетонных опорах) – 139,0 м
7.	Озеленение внешней площадки территории завода – 9193 кв. м
8.	Подъездные железнодорожные пути – 108,2 м
9.	Машина холодильная ХМ-ФУ 401
10.	Бак для охлаждения воды
11.	Бак для разведения рассола ВПС-2,0-0,2 Г
12.	Градирня
13.	Шкаф силовой ЩР 11-73504
14.	Плита электрическая П-4
15.	Кипятильник КН 100 м
16.	Линия ЛГС

Имущество, входящее в состав лота, расположено на земельном участке площадью 2,8839 га, кадастровый номер 623684300001000395.

Имущество, входящее в состав лота, обременено договорами аренды.

Начальная цена – 9 400 000 000 белорусских рублей без учета НДС.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 470 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый лот. Процедура проведения торгов указана в порядке проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов подписывается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в следующем порядке: 15 (пятнадцать) процентов от цены продажи, определенной в результате аукциона, с учетом внесенного задатка, перечисляются победителем торгов продавцу в течение 20 календарных дней с даты проведения аукциона; оставшаяся часть – в течение 60 календарных дней с даты проведения аукциона.

Аукцион состоится **21 января 2010 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с **06.01.2010 по 19.01.2010** включительно в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017)227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»;
(+375 29)636 86 81 – ОАО «Минское производственное кожевенное объединение» Минский район.

Сайт в интернете: www.mgcn.by

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
22 января 2010 года
ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
по продаже двухэтажного кирпичного здания с инвентарным номером 500/С-17147 общей площадью 374,2 кв. м, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Ангарская, д. 5, корп. 6.

Начальная цена – 914 417 100 белорусских рублей. Площадь земельного участка 0,0739 га.

На продаваемое здание обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней и примененных экономических санкций.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток в размере 90 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Аукцион состоится **22 января 2010 года** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 06.01.2010 по 20.01.2010** включительно в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: (017) 227 48 36.
Сайт в интернете: www.mgcn.by

«НЕ ДЛЯ ТАГО Ж СТОЛЬКІ ВУЧЫЎСЯ, КАБ ВАГОНЫ РАЗ

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

6 студзеня 2010 г.
№ 1 (195)

Бюджэт вобласці сфарміраваны без дэфіцыту

У мінулым годзе агульнай тэндэнцыяй для прадпрыемстваў усіх галін народнай гаспадаркі Мінскай вобласці стала замаруджванне тэмпаў эканамічнага росту, выкліканае ў першую чаргу скарачэннем плацежаздольнага попыту на ўнутраным і знешнім рынках, павелічэннем складскіх запасаў, памяншэннем прыбытку, зніжэннем рэнтабельнасці, дэфіцытам абаротных сродкаў і падаражэннем крэдытных рэсурсаў. Пра гэта паведаміў на чарговай сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў намеснік старшыні Мінаблвыканкама, дэпутат Мінскага абласнога Савета Аляксандр ЯРМАК.

Асноўнай праблемай вобласці дэпутат назваў высокую залежнасць ад экспарту прадукцыі машынабудавання і металаапрацоўкі, а таксама прадукцыі сельгаспера-рапрацоўкі. Ключавую ролю ў эканоміцы вобласці адыгрывае экспарт калійных угнаенняў, велікагрузных машын і прадукцыі для аўтапрама, на якую ў сучасных умовах зніжаны попыт, адпаведна ўпала і цана.

Паводле папярэдняй ацэнкі, прадпрыемствы і арганізацыі вобласці завяршылі год з аб'ёмам прамысловай прадукцыі на ўзроўні 89 працэнтаў да паказчыка 2008 (пры прагнозе 113,5). «Гэта абумоўлена ў першую чаргу тым, што на прадпрыемствах рэспубліканскай формы ўласнасці значны недабор прадукцыі («Белкалій», агрэгатныя заводы Барысава, БелАЗ і г.д.)». Дэпутат аблсавета нагадаў, што ў прадпрыемстваў мяса-малочнай галіны летам была складаная сітуацыя са збытам прадукцыі ў Расію. Узнікалі праблемы і па прадпрыемствах пазаведамаснага падпарадкавання. «Аднак прапрацоўка тых планаў і рынкаў збытку, якія прагназуюцца на 2010 год, паказвае, што дынаміка па гэтых прадпрыемствах будзе станоўчай», — запэўніў Аляксандр Ярмак.

Асноўным фактарам росту аб'ёму прамысловай вытворчасці ў 2010 годзе можа стаць пазітыўная дынаміка попыту на калійныя ўгнаенні «Беларуськалія», якую чакаюць спецыялісты. У 2010 годзе прадпрыемства плануе рост прамысловай прадукцыі на 46 працэнтаў да ўзроўню 2009-га. Прырост прагназуецца за кошт павелічэння агульнага аб'ёму вытворчасці, змянення структуры вытворчасці і павелічэння выпуску хлорыстага грануляванага калію.

РУП «БелАЗ» прагназуе тэмп росту аб'ёму прамысловай вытворчасці на 2010 год у памеры 116 працэнтаў. Для паляпшэння якасці выпускаемай прадукцыі, павелічэння аб'ёму яе вытворчасці і выпуску новай канкурэнтаздольнай тэхнікі ў 2009 годзе прадпрыемства абнавіла парк абсталявання, на мадэрнізацыю было скіравана 43,4 млрд рублёў.

У 2010 годзе прагназуемы аб'ём вытворчасці прамысловай прадукцыі па прадпрыемствах «Мінаблмясамалпрам» у супараўнальных цэнах складзе 109,5 працэнта. Адным з асноўных кірункаў развіцця перапрацоўчай прамысловасці вобласці ў 2010 годзе стане нарошчванне аб'ёмаў вытворчасці харчовых тавараў з улікам павышэння іх якасці і канкурэнтаздольнасці, укараненне новых відаў прадукцыі.

Што датычыцца энергазберажэння, то за 2009 год мэтавы паказчык склаў мінус 3,2 працэнта пры гадавым заданні мінус 13,5. Галоўнай прычынай невыканання стала зніжэнне тэмпу росту вытворчасці прамысловай прадукцыі.

Асноўнай задачай АПК вобласці ў новым годзе Аляксандр Ярмак назваў стабільную работу галін сельскай гаспадаркі і павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці сельгаспрадукцыі. Па выніках 2009 года гаспадаркі ўсіх катэгорый вырабілі прадукцыі на ўзроўні 100 працэнтаў да паказчыку 2008 года. У 2010-м плануецца забяспечыць тэмп росту валавой прадукцыі не менш за 110—111 працэнтаў.

«Пры гэтым мы павінны разумець, што рэалізаваўшы тое, што запланавана, мы здолеем кампенсаваць адставанне 2009 года і забяспечыць выкананне 5-гадовага плана па вобласці», — падкрэсліў дэпутат.

Вынікамі выканання бюджэту мінулага года і праектам бюджэту-2010 дэпутатаў пазнаёміў начальнік фінансавага ўпраўлення аблвыканкама Юрый ШКІРУЦЬ. Паводле яго слоў, у бюджэт вобласці паступіла падатковых і непадатковых плацяжоў крыху больш за 2,3 трлн рублёў (альбо 86 працэнтаў ад удакладненага гадавога плана). Невыкананне даходаў склала 366 млрд рублёў. Пры тым, што ў ходзе выканання бюджэту бягучага года план кансалідаванага бюджэту вобласці быў зменшаны на 262,3 млрд рублёў. Найбольшае зніжэнне плацяжоў і адпаведна невыкананне плановых значэнняў склалася па падатку на прыбытак і мэтавых зборах. Удзельная вага падатку на прыбытак зменшылася ў 2009 годзе ў параўнанні з папярэднім амаль у два разы. У асноўным гэта звязана з цяжкасцямі па рэалізацыі прадукцыі вытворчага рэспубліканскага аб'яднання «Беларуськалій». Астатнія даходныя крыніцы засталіся ў межах плана — з невялікім адхіленнем у большы ці меншы бок.

Пры фінансаванні планавых мерапрыемстваў бюджэту-2009 прыярытэт аддаваўся першачарговым расходам — заработнай плаце, прадуктам харчавання, медыкаментам, жыллёваму будаўніцтву, міграцыйнай дзейнасці. У 2009-м на фінансаванне расходаў па галінах сацыяльнай сферы вобласці было накіравана амаль 1,7 трлн рублёў, што склала 50,2 працэнта ад агульных расходаў.

Значная падтрымка аказана аграрнаму сектару вобласці — у 2009 годзе з бюджэту выдаткавана 273,2 млрд рублёў. На пагашэнне страт і субсідый, а таксама на іншыя патрэбы прадпрыемстваў ЖКГ было скіравана 357,9 млрд.

2010-ы — трэці год, які давядзецца перажываць ва ўмовах крызісу, адзначыў фінансіст, таму бюджэт вобласці сфарміраваны ва ўмовах жорсткай эканоміі і ў першую чаргу будзе накіроўвацца на сацыяльную абарону насельніцтва, на будаўніцтва жылля і на інавацыйныя праграмы.

Асаблівасцю бюджэту гэтага года з'яўляецца тое, што разам з зацвержанымі нарматывамі адлічэнняў па падатку на даходы і прыбытак, падатку на дабаўленую вартасць, вобласці даводзіцца і верхняя мяжа сумы паступленняў, роўная плану, вызначанаму Мінфінам. Магчымае перавыкананне будзе адымацца ў рэспубліканскі бюджэт, патлумачыў выступоўца.

Фарміраванне даходнай часткі бюджэту здзейснена з улікам патрабаванняў Бюджэтнага кодэкса, закона Рэспублікі Беларусь «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2010 год» і з улікам адмены наступных падаткаў і збораў: збору ў фонд падтрымкі вытворцаў сельгаспрадукцыі, мясцовага падатку з продажу тавараў рознічнага гандлю, падатку на набыццё аўтатранспарту і мясцовага збору з карыстальнікаў за паркоўку транспартных сродкаў у спецыяльна абсталяваных месцах. Згодна з Бюджэтным кодэксам, акцызы на вермут і віны, якія раней паступалі ў бюджэт вобласці, цалкам будуць залічацца ў рэспубліканскі бюджэт. У Законе Рэспублікі Беларусь «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2010 год» адсутнічае норма, якая дазваляе мясцовым Саветам павышаць ці паніжаць стаўкі падатку на зямлю і нерухомасць, падкрэсліў Юрый Шкіруць. Але гэта права будзе дадзена асобным нарматыўным актам, які зацвердзіць кіраўнік дзяржавы.

У сувязі з прыпыненнем дзеяння артыкула 33 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб зямлі, у 2010 годзе сродкі, атрыманыя за зямельныя ўчасткі, не будуць насіць мэтавы характар. Акрамя таго, будзе павялічана стаўка падатку на дабаўленую вартасць — да 20 працэнтаў.

У склад бюджэту вобласці ўключаны сродкі абласнога інавацыйнага фонду аблвыканкама — 27,8 млрд рублёў і фонду аховы прыроды — 34,4 млрд рублёў («З 2007 года яго забралі ў рэспубліканскі бюджэт, а цяпер вярнулі назад»). Створаны рэзервовыя фонды мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў у суме 132,8 млрд рублёў, з якіх 106,3 млрд рублёў будуць расходавацца згодна з рашэннем кіраўніка дзяржавы.

З улікам вышэйсказанага даходы бюджэту вобласці на 2010 год (без уліку бязвыплатных паступленняў з рэспубліканскага бюджэту) прагназуюцца ў суме 2 трлн 647 млрд рублёў, ці амаль 113 працэнтаў.

У 2010 годзе транспартны збор на аднаўленне транспарту агульнага карыстання і збор на ўтрыманне і развіццё інфраструктуры горада пераўтвораны ў збор на развіццё тэрыторыі, які будзе залічацца ў 2010 годзе ў памеры 2 працэнтаў ад прыбытку, які застаецца ў распараджэнні прадпрыемстваў. Два зборы аб'ядналі ў адзін, які не будзе мець мэтавага характару. Акрамя таго, дэпутаты прагаласавалі за ўвядзенне збору з нарыхтоўшчыкаў і збору за валоданне сабакамі, а таксама падатку на паслугі. Гэтыя сродкі залічаюцца ў бюджэты раёнаў — за выключэннем падатку за паслугі сотавай сувязі.

У 2010 годзе захаваецца сацыяльная зарыентаванасць бюджэту. Асігнаванні на фінансаванне сацыяльных галін і мерапрыемстваў па сацыяльнай абароне насельніцтва вызначаны ў суме 1 трлн 909 млрд рублёў, што складае 52,5 працэнта ад усіх расходаў бюджэту.

Інга МІНДАЛЁВА.

КАМПЕТЭНТНА

МЯСЦОВЫЯ БЮДЖЭТЫ ЗНОЎ «ЗАЦЯГНУЦЬ ПАЯСЫ»,

але не так моцна, як у мінулым годзе

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

З 1 студзеня 2010 года ўсе фінансавыя адносіны на тэрыторыі нашай краіны пачалі рэгулявацца нормамі новага Бюджэтнага кодэкса. Якім чынам гэта адаб'ецца на фарміраванні мясцовых бюджэтаў? Па тлумачэнні мы звярнуліся да начальніка галоўнага ўпраўлення бюджэтнай палітыкі Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь Максіма ЕРМАЛОВІЧА.

— Максім Леанідавіч, ці змяніліся даходныя крыніцы бюджэтаў першаснага ўзроўню?

— Практычна ніякіх зменаў тут не адбылося. Таму што яшчэ на стадыі фарміравання Бюджэтнага кодэкса мы заклалі туды адпаведныя нормы вядомага Указа № 21, якія датычацца даходных крыніц і расходных паўнамоцтваў першасных бюджэтаў. І цяпер Бюджэтны кодэкс проста дублюе існуючыя нормы ўказа ў гэтых адносінах. А ўказ не адменены толькі таму, што ён рэгулюе яшчэ і іншыя кірункі.

— Як можа адбіцца на мясцовых бюджэтах адмена падатку з продажу?

— Сапраўды, раённыя Саветы дэпутатаў часам прымалі рашэнні аб размеркаванні падаткаў з продажу на карысць першасных бюджэтаў. Гэтыя падаткі фарміраваліся на ўзроўні раёна і былі рэгулюючай крыніцай даходаў для бюджэтаў першаснага ўзроўню. Але з 2010 года падатак з продажу адменены, і цяпер такой даходнай крыніцы не існуе.

— Для многіх сельскіх Саветаў гэта адчувальная страта...

— Таму на ўзроўні раёнаў будуць прымацца пэўныя меры, каб гэту крыніцу замяніць на нейкую іншую. Самы просты спосаб — замяніць яе датацыяй, што, напэўна, і будзе зроблена. А магчыма, раённыя Саветы прымуць іншае рашэнне па вызначэнні даходных крыніцаў першасных бюджэтаў.

У чым мы бачым тут выйсце? Мінфін ужо разгледзеў пытанне (і яно, у прынцыпе, узгоднена з усімі неабходнымі інстанцыямі) аб тым, каб на стадыі фарміравання змяненняў у Бюджэтны кодэкс на 2011 год вызначыць у якасці дадатковай крыніцы бюджэтаў першаснага ўзроўню **падаходны падатак з фізічных асобаў**. Ужо сёння мы фарміруем прапановы па ўнясенні гэтых змяненняў, якія пачнуць дзейнічаць з наступнага, 2011 года — яшчэ ж мяняецца, не стаіць на месцы, значыць, павінна мяняцца і бюджэтнае заканадаўства. Інакш кажучы, падаходны падатак як рэгулюючая даходная крыніца першасных бюджэтаў з'явіцца толькі праз год.

— З пачаткам дзеяння Закона «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» ў першасныя бюджэты вяртаецца самаабкладанне — добраахвотныя ўзносы грамадзян.

— Так, самаабкладанне ў нас будзе ўведзена ў адпаведнасці з Законам «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні». (У Бюджэтным кодэксе гэта норма пакуль што адсутнічае.) Разам з тым, сёння Бюджэтны кодэкс не дазваляе мясцовым органам улады мець пазабюджэтныя фонды, дзе раней акумуляваліся ўсе добраахвотныя ўзносы грамадзян. Гэтыя грошы будуць залічацца ў мясцовы бюджэт, што не стварае ніякіх перашкодаў на шляху самаабкладання. Існуе вялікі вопыт — калі грамадзяне фарміруюць даходы бюджэту за кошт добраахвотных узносаў, і гэтыя мэтавыя сродкі, так званыя ахвяраванні, накіроўваюцца на вырашэнне праблем сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Сёння галоўнае, каб яны перараз-мяркоўваліся менавіта праз бюджэты, каб быў перакрыты шлях нейкім «прыватным ініцыятывам», калі грошы збіраліся і выдаткоўваліся невядома на што. Усе добраахвотныя ахвяраванні павінны паступаць у мясцовы бюджэт, працэдура іх размеркавання будзе празрыстай, праз сістэму казначэйства. Толькі пры такіх умовах грамадзянін, які ўнёс свае грошы на тыя ці іншыя мэты, будзе ўпэўнены, што яны пойдуць па прызначэнні. Тут няма ніякіх праблем і супярэчнасцяў, а ёсць толькі павышэнне адказнасці мясцовай улады за размеркаванне ахвяраваных сродкаў плюс празрыстасць — каб любое расходаванне можна было б публічна пракантраляваць.

Пры адсутнасці ж у гэтым працэсе кантролю казначэйства, пры непразрыстым размеркаванні сродкаў (праз тыя ж небюджэтныя фонды) могуць узнікаць злоўжыванні.

— Ці застануцца на базавым узроўні падаткі, атрыманыя ад новаўтвораных малых прадпрыемстваў, якія знаходзяцца на падведамаснай тэрыторыі?

— Застануцца. Усе падаткі ад створаных з 2007 да 2011 года малых прадпрыемстваў будуць залічвацца ў мясцовыя бюджэты ў поўным аб'ёме. Інакш кажучы, падаткі, якія выплачваюць гэтыя арганізацыі, будуць фарміраваць даходы мясцовых бюджэтаў на базавым узроўні.

— А калі прадпрыемства знаходзіцца на тэрыторыі сельсавета, орган першаснага звяна ўлады можа прэтэндаваць на адлічэнні ад падаткаў непасрэдна ў свой бюджэт?

— Гэта вельмі ўскладніла б падатковае адміністраванне па такім прадпрыемстве. У нас падатковая інспекцыя ўсёроўна знаходзіцца ў раёне, і ўсе паступленні прадпрыемстваў і арганізацый залічваюцца ў бюджэт базавага (раённага) узроўню. І ўжо ў кампетэнцыі раённага Савета вырашаць, вяртаць частку гэтых паступленняў у бюджэт адпаведнага сельсавета ці не. Калі, напрыклад, першасны орган улады пацвердзіць, што менавіта па яго ініцыятыве і з яго непасрэдным удзелам было створана тое ці іншае прадпрыемства і што яно, скажам, за паўгода выплаціла ў бюджэт даволі значную суму падаткаў — тады кіраўнік першаснага органа ўлады мае права ставіць пытанне перад уладамі раёна, каб праз датацыю базавы ўзровень гэтыя грошы вярнуў. Падзяліць грошы ў межах базавага ўзроўню, паміж раённым бюджэтам і сельвыканкамам — гэта справа фінансістаў-прафесіяналаў і мясцовай улады.

Але перш за ўсё трэба вызначыць, ці мэтазгодныя такія адлічэнні ў нізавы бюджэт, ці будуць яны сувымяральныя з яго расходнымі паўнамоцтвамі.

— Доўгі час для мясцовай улады права распараджэння зямельнымі плацяжамі — паступленнямі ад продажу зямельных участкаў, ад карыстання зямлёй — было абмежаванае. З 2010 года яно пашырыцца?

— Так, мэтавага выкарыстання зямельных плацяжоў больш не будзе. Мы прыпынілі адпаведную норму Зямельнага кодэкса і плануем унесці змяненні ў зямельнае заканадаўства — адмяніць «прывязку» сродкаў, атрыманых ад продажу зямлі, да мэтавага размеркавання. На гэтым настойваюць практычна ўсе рэгіёны краіны, таму што «прывязка» звужае магчымасці выкарыстання грошай, атрыманых за зямлю, — асабліва ў сталічным раёне і раёнах абласнога цэнтра, дзе ў бюджэт паступаюць значныя рэсурсы ад правядзення аўкцыёнаў па продажы ўчасткаў.

«Маркіраваць» даходныя крыніцы — гэта ўвогуле няўдзячная справа. Расходы не могуць «прывязвацца» да той ці іншай даходнай крыніцы, яны павінны забяспечваць агульныя патрэбы. Мы цяпер да гэтага ідзём.

— Ці застанецца за Саветамі права павялічваць (ці памяншаць) стаўку зямельнага падатку?

— Застанецца. Міністэрствам фінансаў падрыхтаваны праект указа, у якім гэта права захаваецца: мясцовыя Саветы дэпутатаў могуць павялічваць (але не больш, чым у два разы!) стаўкі падаткаў: зямельнага і на нерухомасць.

Вызначана і яшчэ адна норма — цяпер падатак на зямлю будзе вылічацца **ў залежнасці ад яе кадастравага кошту** (раней ён вызначаўся ў залежнасці ад бальнасці зямлі, месцазнаходжання, аддаленасці ад цэнтра і г.д.). Як гэта паўплывае на абавязацельствы па выплаце зямельнага падатку, пакуль гаварыць складана. У любым выпадку, у мясцовых органаў улады будзе ў руках «інструмент» рэгулявання, які дазволіць выраўноўваць умовы падаткаабкладання — напрыклад, там, дзе плацяжы ў сувязі з пераходам на кадастравую ацэнку істотна ўзрастуць.

Акрамя таго, гэта будзе дадатковай крыніцай даходаў — мы падлічылі, што каля 500 мільярдаў рублёў можа паступіць у бюджэт у выніку павелічэння ставак зямельнага падатку.

— Сельскія Саветы — аб чым гаварылася неаднойчы — павінны паступова адыходзіць ад гаспадарчай дзейнасці, таму што яны — орган улады, а не гаспадарання. Шмат у каго ўзнікае пытанне: а што, напрыклад, рабіць са зборам насельніцкага малака, калі гэтым займаўся — і не без поспеху — сельскі Савет? І куды будуць залічвацца грошы, атрыманыя за арганізацыю збору малака — калі пазабюджэтныя рахункі адмяняюцца?

— Гэтыя грошы ніколі і не з'яўляліся «пазабюджэтнымі» — яны паступалі на аператыўны рахунак сельвыканкама і фактычна ішлі на забеспячэнне самога працэсу збору малака (аплату малаказборшчыкам і да т.п.). Што будзе з «малочнымі грашыма» цяпер? Ды нічога, усё застанецца як ёсць — яны, паўтаруся, не з'яўляюцца пазабюджэтнымі сродкамі. Але адыходзіць ад гэтай дзейнасці Саветам паступова трэба. І з цягам часу перадаваць яе СВК ці іншым спецыялізаваным арганізацыям... Думаю, паступова тут усё само вырашыцца, з гэтай нагоды не хацелася б ствараць сёння дадатковую напружанасць.

— А за кошт якіх сродкаў утрымліваць тыя ж вясковыя могілкі? І хто павінен гэтым займацца?

— Я разумею, што часам старшыні сельскага Савета прасцей выйсці самому з газонакасілкай, давесці да ладу гэтыя могілкі і ні перад кім не ставіць пытанне. Гэта, зноў жа, няправільна. Але цяпер складаны час, мы вельмі абмежаваныя ў рэсурсах, а значыць, вымушаны закасваць рукавы і ісці рабіць тое, што, магчыма, для нас не ўласціва. Таму павінна пакуль захавацца практыка, у адпаведнасці з якой за стан і добраўпарадкаванне могілак адказвае менавіта першасны ўзровень улады. Напэўна, сёння гэты шлях аптымальны, хоць ён і не выключае рызыкі, звязанай са схемай фінансавання работ па добраўпарадкаванні.

— Фінансава-эканамічны крызіс працягваецца. Ці навучыліся мясцовыя ўлады расходаваць грошы больш эканомна?

— Сёння кожны павінен паставіць перад сабой задачу: забяспечыць фінансаванне першачарговых артыкулаў — выплаты заработнай платы і стыпендый, расходаў на ахову здароўя, адукацыю, сацыяльнае забеспячэнне... Мне здаецца, што ўсе рэгіёны з гэтай задачай справіліся паспяхова, у нас не ўзнікае цяжкасцяў з фінансаваннем **першачарговых расходаў**.

Аднак не ўсе рэгіёны ў аднолькавай ступені скарацілі **непершачарговыя расходы** — а менавіта расходы на добраўпарадкаванне. У 2009 годзе будаваліся аб'екты, якія можна было не будаваць — гэта датычыцца ўсялякіх забаўляльных цэнтраў, скульптур, культурных кампазіцый, фантанаў і іншага, на чым можна было б эканоміць. Трэба жыць больш сціпла, аднак не ўсе ў аднолькавай ступені рэагуюць на новыя ўмовы... У 2010-м патрабаванні па максімальным уразанні непершачарговых расходаў захаваюцца.

— Інакш кажучы, год абяцае быць па-ранейшаму складаным?

— У фінансава-эканамічным плане год чакаецца менш цяжкі, чым 2009-ы. Спадзяюся, што ён стане паваротным у сэнсе выхаду з крызісу. У мясцовых бюджэтах з'явіцца больш рэсурсаў, а сама бюджэтная палітыка памякчэе.

Наталля КАРПЕНКА.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ПАСЛЯ ВЫСТУПЛЕННЯ «МС»

АПТЫМІЗАЦЫЯ Ў ДЗЕЯННІ

У нумары за 4 лістапада быў змешчаны артыкул «За» і «супраць» аб'яднання», напісаны на падставе ліста жыхароў вёсак Талькаўскага сельсавета Пухавіцкага раёна. У лісце, дасланым у рэдакцыю, аўтары патрабавалі спыніць працэс ліквідацыі Талькаўскага сельсавета і далучэння яго тэрыторыі да Блужскага, бо, на іх думку, адпаведнае рашэнне было непрадуманым і прынята яно без уліку меркаванняў жыхароў. Днямі мы атрымалі афіцыйнае рэагаванне на ўзнятую ў артыкуле праблему з Мінскага абласнога выканаўчага камітэта.

«...Зварот жыхароў вёскі Талька Талькаўскага сельсавета Пухавіцкага раёна, накіраваны ў рэдакцыю газеты «Звязда», разгледжаны з выездам на месца.

Па фактах, выкладзеных у публікацыі, паведамляем наступнае.

Улічваючы нераўнамернае вытворчае і сацыяльна-культурнае развіццё рэгіёнаў, шчыльнасць насельніцтва, розны прамысловы, сельскагаспадарчы і сацыяльна-культурны ўзровень, геаграфічныя асаблівасці размяшчэння сельсаветаў, развіццё дарожна-транспартнай інфраструктуры, у Мінскай вобласці з 2006 па 2009 год была праведзена работа па аптымізацыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання пярвічнага ўзроўню.

Пры змяненні межаў сельсаветаў улічвалася размяшчэнне на іх тэрыторыі аграгарадкоў (з улікам тых, што будуюцца), межы сельскагаспадарчых арганізацый, практыка фарміравання выбарчых акруг у мясцовыя Саветы дэпутатаў усіх узроўняў, аналізаваліся і ўлічваліся звароты і скаргі грамадзян, якія пражываюць у сельскай мясцовасці.

Праведзеная аптымізацыя адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання пярвічнага тэрытарыяльнага ўзроўню вобласці дазволіла збалансаваць сацыяльна-эканамічнае развіццё тэрыторый, палепшыла магчымасці кіравання імі. Пытанні жыццядзейнасці ліквідаваных сельсаветаў вырашаліся аператыўна і своечасова.

У жніўні-верасні 2009 года у сельскіх населеных пунктах вобласці, у тым ліку і ў Пухавіцкім раёне, праведзеныя сходы па месцы жыхарства (сустрэчы ў працоўных калектывах) з мэтай вывучэння меркавання грамадзян, якія пражываюць у сельскай мясцовасці, па пытанні верагоднага змянення межаў сельсаветаў. На ўсіх сустрэчах прысутнічалі адказныя работнікі райвыканкамаў, якія давалі тлумачэнні па пытаннях, што ўзнікалі ў грамадзян падчас правядзення сходаў.

У цэлым жыхары аб'ядналых сельсаветаў з разуменнем паставіліся да пытання аптымізацыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання пярвічнага ўзроўню.

У кастрычніку 2009 года Саветамі дэпутатаў базавага ўзроўню ў Мінскі абласны Савет дэпутатаў былі ўнесены прапановы па далейшай аптымізацыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання пярвічнага ўзроўню.

На падставе рашэння Мінскага абласнога Савета дэпутатаў ад 30 кастрычніка 2009 года № 219 «Аб змяненні адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання Мінскай вобласці» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 09.12.2009, 9/27828) ліквідаваныя 29 адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак пярвічнага ўзроўню ў 13 раёнах вобласці.

Гэтыя змяненні (ліквідаванне, утварэнне, змяненне межаў сельсаветаў) абумоўлены сацыяльнымі, эканамічнымі ўмовамі: колькасцю насельніцтва, населеных пунктаў, асаблівасцю іх размяшчэння (адлегласць і сувязь паміж імі), забеспячэннем цэласнасці тэрыторый (сельгасугоддзяў) сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, а таксама забеспячэннем роўных умоў у рабоце органаў мясцовага кіравання і самакіравання (сельскіх выканаўчых камітэтаў) па вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва.

Па пытанні аб'яднання Блужскага і Талькаўскага сельсаветаў Пухавіцкага раёна паведамляем наступнае.

На тэрыторыі Блужскага сельсавета пражывае 834 жыхары (плошча — 4,9 тыс. га), на тэрыторыі Талькаўскага сельсавета — 811 (плошча — 2,7 тыс. га). Гэтыя сельсаветы геаграфічна мяжуюць адзін з адным, прычым працягласць агульнай мяжы складае 2/3 усёй мяжы Блужскага сельсавета. На тэрыторыі сельсаветаў размешчана адно базавае прадпрыемства з адміністрацыйным цэнтрам у вёсцы Блужа — сельскагаспадарчы філіял «Чырвоны май» ААТ «Мінскі завод пеністых вінаў» (агульная плошча земляў — 5780 га). Цяпер на тэрыторыі Блужскага сельсавета вядзецца будаўніцтва аграгарадка, на тэрыторыі Талькаўскага сельсавета аграгарадка няма і ў найбліжэйшы час яго будаўніцтва не плануецца.

Даведачна. Паводле ацэнкі вучоных, аптымальная пярвічная тэрытарыяльная адзінка ў сельскай мясцовасці павінна выглядаць наступным чынам: яе тэрыторыя павінна быць роўнай тэрыторыі базавага сельскагаспадарчага прадпрыемства, цэнтрам сельсавета павінен з'яўляцца аграгарадок — адміністрацыйны цэнтр з адпаведнай вытворчай і сацыяльнай інфраструктурай. Аптымальная колькасць насельніцтва сельсавета — не менш за 2 тысячы чалавек. Найбольш эканамічнай і рэнтабельнай па колькасці ўкладання бюджэтных сродкаў з'яўляецца плошча базавай гаспадаркі ад 7 да 10 тысяч га.

На падставе вышэйвыкладзенага было разгледжана пытанне аб ліквідаванні Талькаўскага сельсавета шляхам далучэння да Блужскага.

Перад тым, як унесці ў парадак дня сесіі Талькаўскага сельскага Савета дэпутатаў пытанне аб далучэнні Талькаўскага сельсавета да Блужскага, праводзілася работа па вывучэнні грамадскай думкі шляхам апытання і правядзення сходаў грамадзян у населеных пунктах.

Падчас правядзення сходаў былі дадзены адпаведныя тлумачэнні наконт таго, што пасля аб'яднання сельсаветаў для абслугоўвання жыхароў былога Талькаўскага сельсавета плануецца пакінуць у вёсцы Талька спецыяліста першай катэгорыі для выдачы даведак і вырашэння іншых пытанняў. Таксама ў вёсцы Талька будзе арганізаваны выязны прыём грамадзян старшынёй і сакратаром Блужскага выканкама (падобная практыка станоўча зарэкамендавала сябе ў аб'яднаных ў 2006 годзе сельсаветах).

Было вывучана меркаванне насельніцтва. Большасць жыхароў адзначыла станоўчы момант у тым, што на тэрыторыі аднаго сельсавета будзе размяшчацца адна гаспадарка.

Нягледзячы на тое, што ні адзін нарматыўны дакумент не патрабуе папярэдняй згоды насельніцтва пры змяненні адміністрацыйна-тэрытарыяльнага ўладкавання, Пухавіцкі раённы выканаўчы камітэт і Пухавіцкі раённы Савет дэпутатаў імкнуцца максімальна ўлічваць інтарэсы і пажаданні насельніцтва і не толькі захаваць існуючы рэжым забеспячэння жыццядзейнасці, але і істотна палепшыць яго.

Прапановы і заўвагі, выказаныя грамадзянамі на сходах (пытанні транспартнай сувязі, гандлёвага абслугоўвання, грэйдавання дарог, добраўпарадкавання населеных пунктаў, медыцынскага абслугоўвання), абагульнены, акрэслены меры па іх рэалізацыі.

Па ўсіх пытаннях, выкладзеных у калектыўным звароце, заяўнікам дадзены адказ Пухавіцкім раённым Саветам дэпутатаў і Пухавіцкім раённым выканаўчым камітэтам.

Работа па выкананні даручэнняў кіраўніка дзяржавы, скіраваных на павышэнне ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання пярвічнага ўзроўню ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва, знаходзіцца на пастаянным кантролі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў і Мінскага абласнога выканаўчага камітэта».

Падрыхтавала Інга МІНДАЛЁВА.

Каляднае

Народная лекарка Фядора КОНЮХАВА:

«РАЗЛІЧВАЙЦЕ ТОЛЬКІ НА ДАБРЫНЮ!»

— Фядора Данілаўна, з якім настроем вы сустрэлі Новы год і адзначыце свята Нараджэння Хрыстова?

— Я ўсё думаю, каб было лепей за мінулы год. Каб ва ўсіх людзей быў добры настрой. Каб людзі верылі, што мы — наперадзе ўсіх. Будзем дзяцей сваіх вучыць добрым справам, каб яны верылі ў Бога і бачылі вольнае жыццё. Беларускія дзеці нясуць у свет дабрыню і святасць.

— Які, паводле вашага адчування, будзе новы 2010 год?

— Навагодняе свята падалося мне спакойным, і такі ж будзе і ўвесь год. Я нават бачыла, што на вакзалах стаяць кветкі. Гэта знакавае ўяўленне: не бруд, а кветкі. Гэта значыць — людзям адкрытыя дарогі. Мне падаецца, што ў гэтым годзе беларусы будуць больш ездзіць на адпачынак і ўвогуле часцей думаць пра сваё здароўе.

— Здароўе — гэта сапраўды вельмі актуальна. Свіны грып моцна напужаў напрыканцы мінулага года.

— Напужаў, таму што ў прыродзе ўсё мяняецца. Харчы выраблялі на хімічных угнаеннях, таму народ слабне. Калі б людзі елі сапраўдныя чыстыя харчы, то былі б здаравейшыя. Якія раней раслі яблыкі ды таматы на зямлі? А цяпер выкіды ў паветры і хімія ў зямлі шкодзяць раслінам і людзям.

— Дык як жа справіцца з жыццёвымі праблемамі?

— Перш за ўсё, разлічваць толькі на дабрыню. А больш практычныя парады: трэба збіраць лекавыя зёлкі і часцей парыцца з венікам у лазні.

І яшчэ вельмі важна шанаваць зямлю сваіх продкаў. Страшна глядзець на нашы вёскі, дзе валяцца старыя хаты. Дзеці, між тым, жывуць у шыкоўных гарадскіх кватэрах і прыязджаюць на сучасных аўтамабілях, а вось матчыну хату закідваюць, не дагледаюць. На мой погляд, добра было б адрамантаваць радавую хату ды ездзіць туды на выхадныя дні. Нават пакорпацца ў зямлі, і то будзе болей здароўя.

— Большасць людзей без шкадаванняў развіталася з цяжкім, крызісным 2009 годам...

— Які крызіс? Мякіну ж не елі. А елі чысты хлеб і запівалі чыстай вадой. Ну ці не так, калі разумна разабрацца? Елі ж дасыта. Вы ведаеце хоць аднаго чалавека, каб у яго на Новы год на стале не было хлеба?

— Не ведаю.

— Правільна. Людзі, на мой погляд, проста забыліся пра жыццё продкаў альбо не ведаюць пра часіны, калі на Новы год не было і аладкі якой. Памятаю, што пасля вайны апошні корж ламалі на святочны стол. А цяпер людзі проста заеліся чыстага хлеба.

Што ж, год ад году людзі вучацца, становяцца больш развітымі, а таксама больш патрабуюць ад свайго жыцця. Цяпер людзі хочуць мець усё болей і болей.

— Гэта, на ваш погляд, добрае альбо дрэннае імкненне?

— Дрэннае. Таму што чалавек не павінен скнарнічаць, а павінен спакойна ставіцца да жыцця: што ёсць сёння, тое і добра.

— Якія будуць вашы парады, каб пражыць новы год добра і быць здаровымі?

— Жыць спакойна і добра рабіць. Трэба ласкава ставіцца да старых і дзяцей.

Шанаваць свой народ і ўсе іншыя нацыі на Зямлі. Калі паважаеш людзей, то і цябе Бог паважае.

— І напрыканцы, Фядора Данілаўна, пажаданні чытачам «Звязды» ў новым годзе.

— Я жадаю толькі дабрыні і самага найлепшага. І каб квітнела наша Беларусь.

Гутарыла Ілона ІВАНОВА.
Бялыніцкі раён.

НА СВЯТЫЯ ВЕЧАРЫ: НЕ ШЫЦЬ, НЕ ПЛЕСЦІ, НЕ СЕКЧЫ...

З 7 па 19 студзеня ў Беларусі адзначалі святкі, або Каляды. На працягу гэтых двух тыдняў увечары забаранялася працаваць, асабліва шыць, плесці, рабіць што-небудзь крывое, а таксама секчы сякерай. Як расказала старшы навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы НАН Беларусі Таццяна КУХАРОНАК, святкаваць святкі пачыналі яшчэ з вечара 6 студзеня.

Да Калядаў рыхтаваліся загадзя: забяспечвалі сябе прадуктамі, гаспадыні старанна прыбіраліся ў хаце, моладзь майстравала маскі і карнавальныя касцюмы, усе мыліся ў лазні, апраналі святочнае адзенне.

Галоўнай стравай на святочным стале ў ноч на Каляды была куцця. Яна гатавалася з ячменю або іншых круп з алеем або мёдам. Есці куццю пачыналі са з'яўленнем на небе першай зоркі. Калі ўсе размясціліся за сталом, гаспадар браў першую лыжку куцці і запрашаў мароз у госці: «Мароз, мароз, прыходзь куццю есці, каб ты не марозіў ячмень, пшаніцу, гарох, сачавіцу, проса, грэчку і ўсё, што мне Бог дасць пасеяць».

У гэту ноч сачылі за станам надвор'я, каб даведацца прагноз на год. Шмат зорак на небе прадказвала багаты ўраджай пшаніцы, грыбоў, добры прыплод свойскай жывёлы. Калі з-за адлігі чарнела дарога, беларусы верылі, што летам вырасце шмат грэчкі. А вось калі ў гэту ноч за вокнамі моцна мяло, чакалі лета з градам. Шмат шэрані на дрэвах прадказвала багатае ва ўсіх адносінах лета. Аб ураджайным годзе сведчыла і цёплае надвор'е, з невялікім снегам і туманам.

Першы дзень Калядаў, або Ражджаство, святкавалі ад душы. У госці запрашалі родных, сяброў, суседзяў. А ўвечары моладзь пачынала калядаваць. Самым вядомым персанажам у калядоўшчыкаў была каза, якая сімвалізавала ўрадлівасць, дабрабыт і пладавітасць. І ў кожным доме іх чакалі з нецярпеннем: згодна з народным павер'ем, візіт калядоўшчыкаў прынясе шчасце, здароўе, дабрабыт у сям'ю на ўвесь будучы год.

БЕЛТА.

ПАСЕЯЦЬ «ТРАЎКУ» ЗА... 25 МЛН РУБЛЁЎ

Пачасціліся выпадкі заказаў нашымі грамадзянамі за мяжой праз інтэрнэт насення канопляў для незаконнага вырошчвання раслін і вырабу марыхуаны ў хатніх умовах.

Так, Мінская рэгіянальная мытня завяла ў дачыненні да 25-гадовага інжынера аднаго са сталічных прадпрыемстваў крымінальную справу па арт. 329 Крымінальнага кодэкса «Пасеў або вырошчванне забароненых для вырошчвання раслін і грыбоў, якія ўтрымліваюць наркатычныя рэчывы або псіхатропныя рэчывы». Падчас вобыску ў кватэры маладога чалавека былі знойдзены парасткі канопляў, якія ўтрымлівалі, паводле хіміка-крыміналістычнай экспертызы, псіхатропныя рэчывы, драўляная скрыня з прыстасаваннямі для асвятлення, увільгатнення і вентыляцыі падчас вырошчвання, а таксама камп'ютарныя раздрукоўкі з парадамі па занятку падобнага кшталту.

Аператыўнікі КДБ па г. Мінску і Мінскай вобласці высветлілі, што інжынер набыў насенне канопляў шляхам афармлення электроннага заказу на адным з замежных сайтаў інтэрнэту. Там жа азнаёміўся з рэкамендацыямі іншых аматараў дурману, сабраў і абсталяваў спецыяльную скрыню, дзе і вырасціў некалькі раслін.

Суд Першамайскага раёна г. Мінска напрыканцы мінулага года прызнаў маладога чалавека вінаватым у незаконнай падрыхтоўцы да пасеву і вырошчванні забароненых раслін і прызначыў пакаранне ў выглядзе штрафу памерам 700 базавых велічыняў, або каля 25 мільёнаў рублёў.

Паводле інфармацыі прэс-службы ўпраўлення КДБ па г. Мінску і Мінскай вобласці, у некаторых краінах — Галандыі, Германіі, Швейцарыі, асобных штатах ЗША — ужыванне лёгкіх наркотыкаў раслінnага паходжання легалізавана ў той ці іншай форме, напрыклад, дазволена ў спецыяльных месцах, з абмежаваннямі па ўзросце, па колькасці захоўвання і г.д. У гэтых краінах працуюць крамы, у якіх можна набыць насенне канопляў для навуковых, даследчых і іншых мэтаў. Многія з гэтых крамаў маюць інтэрнэт-сайты, дзе не выключаецца афармленне электронных заказаў на набыццё насення, у тым ліку з дастаўкай у іншую краіну. Патэнцыяльнага пакупніка пераконваюць, што гэта працэдура з'яўляецца абсалютна законнай. У сапраўднасці ж пакупка такога насення з'яўляецца правамерным дзеяннем толькі для грамадзян, якія тэрытарыяльна знаходзяцца ў краіне-гандляры.

Аматары «траўкі» павінны ўсвядоміць, што не толькі вырошчванне канопляў, але нават заказ яе насення пры наяўнасці іншых абставінаў у адпаведнасці з заканадаўствам нашай краіны можа трактавацца як падрыхтоўка да пасеву і вырошчвання забароненых раслін. За гэта, згодна з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь прадугледжана пакаранне ў выглядзе штрафу, арышту, абмежавання або пазбаўлення волі тэрмінам да 3 гадоў, а ў выпадку паўторнага парушэння або ўчыненага групай асобаў — да 15 гадоў. Грамадзянін нашай краіны, які заказаў, напрыклад, насенне каноплі за мяжой нават выпадкова, не з мэтай карысці пры атрыманні пасылкі на тэрыторыі Беларусі аўтаматычна прыцягваецца да адказнасці.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Тэлесеткі

«ЕЎРАБАЧАННЕ-2010»: НОВЕНЬКІЯ І СТАРЭНЬКІЯ

Колькасць краін — удзельніц 55-га па ліку песеннага конкурсу «Еўрабачанне», які адбудзецца сёлета 25—29 мая ў Осла (Нарвегія), дасягнула 39. Спіс іх быў апублікаваны ў першыя дні новага года на афіцыйным сайце конкурсу. Прычым, напрыклад, Літва, доўга ўзважваючы ўсе «за» і «супраць», пацвердзіла свой удзел літаральна ў апошні момант, 31 снежня — пераважылі высокія рэйтынгі «Еўрабачання» ў гэтай краіне. А вось Чэхія, наадварот, адмовілася ад удзелу з прычыны рэкордна нізкіх рэйтынгаў шоу на тамтэйшым тэлеканале. Выбылі з песеннага спаборніцтва і Чарнагорыя з Венгрыяй — па фінансавых прычынах, вырашылі не рызыкаваць фінансамі і адклалі вяртанне Аўстрыя і Андора; толькі Грузія, якая з палітычным скандалам праігнаравала папярэдні конкурс, пацвердзіла сёлета свой намер пазмагацца за галоўны прыз.

Некаторыя з краін-удзельніц ужо вызначыліся са сваімі прадстаўнікамі на «Еўрабачанні-2010» — так, гэта паспелі зрабіць яшчэ ў мінулым годзе Арменія, Бельгія і Балгарыя, а таксама Украіна, дзе большасцю галасоў экспертнай рады быў абраны колішні ўдзельнік «Славянскага базару» і «Новай хвалі» Васіль Лазаровіч. Як адзначылі ўкраінскія тэлевяшчальнікі, немалаважную ролю ў гэтым выбары адыграў не толькі ўнікальны бас-барытон выканаўцы, але і той факт, што артыст гатовы ўзяць на сябе большасць выдаткаў, звязаных з падрыхтоўкай да конкурсу. Шэраг украінскіх артыстаў, праўда, нязгодныя з выбарам «нікому не вядомай зоркі» і ўжо выказалі публічны пратэст — але наўрад ці НТРК Украіны будзе мяняць коней на пераправе.

Днямі абвясціла аб пачатку прыёму заявак на «Еўрабачанне» і Расія. Адным з найбольш верагодных кандыдатаў тут лічыцца... Дзіма Білан, які папярэдне выказваў жаданне ў трэці раз паспытаць шчасця на еўрапейскай сцэне. Менеджмент артыста пацвердзіў, што гэты варыянт цалкам магчымы — аднак апошняе слова будзе за журы. Сяród іншых патэнцыяльных удзельнікаў называюцца спявак Сяргей Лазараў, а таксама некаторыя выпускнікі «Фабрыкі зорак».

У Беларусі ж сітуацыя па-ранейшаму цьмяная. Афіцыйна заяўнікам ад нашай краіны выступіла Белтэлерадыёкампанія, якая дакладна будзе трансляваць сёлетні конкурс, але хто возьмецца за адбор і падрыхтоўку ўдзельніка, залежыць ад дамоўленасцяў двух вядучых тэлеканалаў. Магчыма, Беларусь будзе прадстаўленая адной з песень — пераможцаў тэлепраекта «Музычны суд», зладжанага АНТ, аднак у чым выкананні яна прагучыць — пытанне пакуль што адкрытае. (Зрэшты, аўтар кампазіцыі — пераможцы першага этапу названага тэлепраекта Яўген Малашка атрымае, як і было абяцана, узнагароду — гасцявую паездку на «Еўрабачанне-2010».)

А як вы лічыце, шаноўныя чытачы, які выканаўца ці калектыў мог бы прадставіць Беларусь на сёлетнім конкурсе? Пакідайце свае варыянты на сайце www.zviazda.by!

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Хакей

ЗАБЛУКАЛІ Ў ЧАСЕ

Тут зліваюцца рэкі Амур і Усуры, Кітай можна памацаць рукой, а да Беларусі больш за дзевяць тысяч кіламетраў. Хабараўск — самы далёкі фарпост Кантынентальнай хакейнай лігі. Учора раніцай (па мінскім часе) «бела-блакітныя» сустракаліся з мясцовым «Амурам».

Хабараўчане займаюць перадапошняе месца ў сваім дывізіёне і амаль не перамагаюць у гасцявых гульнях, але калі супернікі праз некалькі часавых паясоў дабіраюцца да «Плацінум Арэны», яе гаспадары ператвараюцца ў магутных і бязлітасных драпежнікаў. Зусім як белагруды мядзведзь, што змяшчаецца на гербе і клуба, і ўсяго Хабараўскага края.

Траўма пакінула па-за пядынкам лепшага бамбардзіра мінчан Ханэса Хювенена, за якога, праўда, з поспехам адпрацоўваюць іншыя легіянеры. З самага стартавага свістка назіралася хуткая, вострая гульня. І калі кідку Лінтнэра ад сіняй лініі трошкі не хапіла дакладнасці, то Вілі Пелтанен, якога Плат і Кулакоў вывялі аднаго на «пятак», не пакінуў галкіперу «Амура» Тайлеру Мосу ніводнага шанцу. Літаральна праз пару хвілін капітан нашай каманды мог зрабіць дубль, але на гэты раз варатар выратаваў гаспадароў. Канцоўка першага перыяду і ўся другая дваццаціхвілінка праходзілі па амаль аднолькавым сцэнары — усе атакі хабараўчан разбіваліся аб «сцяну» Мезіна, «зубры» ж ніяк не маглі рэалізаваць перавагу ў большасці гульцоў на пляцоўцы пасля частых выдаленняў суперніка. Апошняе нейкім чынам і вызначала канчатковы вынік гульні. У трэцім перыядзе каманды як быццам прачнуліся пасля спячкі і за 56 секундаў закінулі тры шайбы на дваіх. Пасля галявых кідкоў Арэкаева, Качаткова і Какшарова на табло сямітысячнай арэны свяціліся дзве двойкі. Праз некалькі абаротаў секундны стрэлкі ў чарговы раз быў выдалены гулец «Амура» і Аляксандр Андрыеўскі ўзяў тайм-аўт, але гэтым вечарам у «бела-блакітных» так і не атрымалася закінуць у большасці. Гаспадары таксама не стварылі ў астатнія хвіліны нічога вострага ў гульні, а вось пабачыць бойку гледачам давялося: Люткевіч з беларускага боку і Аксененка з расійскага памахаліся кулакамі і адправіліся адпачываць да канца матча. Пераможцу вызначыла серыя булітаў, у якой госці без Антоненкі і Хювенена, на жаль, саступілі. Першы раз у сезоне.

Далей у мінчан заўтрашняя гульня з новакузнецкім «Металургам» і вяртанне ў Еўропу, дзе чакаюць паядынкі з «ЦСКА» ў Маскве і яшчэ адным «Металургам», толькі магнітагорскім, у Мінску. Як паведамілі ў стане клуба, апошняе стане першай на «Мінск-Арэне».

Яўген ВАРАКСА.

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
22 января 2010 года
ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
по продаже обращенного в доход государства здания столовой, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Долгобродская, д. 17 (двухэтажное кирпичное здание общей площадью 1 764 кв. м, год постройки – 1962).

Начальная цена – 3 826 462 680 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 200 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов указана в порядке проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Аукцион состоится **22 января 2010 года** в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 06.01.2010 по 20.01.2010** включительно в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 227 48 36, 227 40 22.

ЗАКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «МЕРКОМ»
8 февраля 2010 г. в 9.00 по адресу: г. Орша, ул. Флерова, 2А в помещении кафе «Никольское» проводит открытый аукцион по продаже права на заключение договоров аренды сроком с 15.02.2010 г. по 31.12.2010 г. торговых объектов, расположенных в г. Орша.

№ лота	Начальная цена лота (бел. руб.)	Размер задатка (бел. руб.)	№ торгового объекта	Адрес арендуемого объекта	Площадь (м.кв.)
1	3 920 000	392 000	2	ТЦ «Мир»	13,36
2	2 130 000	213 000	3	ТЦ «Мир»	7,25
3	2 120 000	212 000	4	ТЦ «Мир»	7,23
4	2 360 000	236 000	12	ТЦ «Мир»	8,03
5	4 750 000	475 000	14	ТЦ «Мир»	16,17
6	4 740 000	474 000	16	ТЦ «Мир»	16,15
7	3 280 000	328 000	17	ТЦ «Мир»	11,16
8	8 490 000	849 000	2.4	ТЦ «Мир»	28,95
9	8 530 000	853 000	2.5	ТЦ «Мир»	29,07
10	2 860 000	286 000	2.6	ТЦ «Мир»	9,74
11	8 370 000	837 000	3.2	ТЦ «Мир»	28,54
12	8 630 000	863 000	3.3	ТЦ «Мир»	29,42
13	8 600 000	860 000	3.4	ТЦ «Мир»	29,3
14	8 460 000	846 000	3.5	ТЦ «Мир»	28,84
15	17 000 000	1 700 000	5.3	ТЦ «Мир»	58,0
16	16 720 000	1 672 000	5.4	ТЦ «Мир»	57,0
17	5 600 000	560 000	5.5	ТЦ «Мир»	19,1
18	8 160 000	816 000	6.2	ТЦ «Мир»	27,81
19	8 320 000	832 000	6.3	ТЦ «Мир»	28,37
20	8 400 000	840 000	6.4	ТЦ «Мир»	28,64
21	4 350 000	435 000	6.6	ТЦ «Мир»	14,83
22	2 380 000	238 000	9	ТЦ «Алтын»	5,68
23	2 550 000	255 000	18	ТЦ «Алтын»	6,08
24	4 190 000	419 000	19	ТЦ «Алтын»	10,0
25	11 820 000	1 182 000	4	ТЦ «Алтын»	28,2
26	3 440 000	344 000	5	ТЦ «Алтын»	8,2
27	7 190 000	719 000	8	ул. Могилевская, 95	24,51
28	4 330 000	433 000	9	ул. Могилевская, 95	14,74

Арендная плата за месяц: 0,6 базовой величины за 1 кв.м арендуемой площади.

Условия продажи: розничная торговля непродовольственными товарами.

Условия оплаты: оплата за право аренды осуществляется в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона. Возможна оплата в рассрочку с заключением договора.

Победителем торгов признается участник, предложивший наибольшую цену за выставленный на продажу лот.

Договор аренды заключается после подписания протокола и оплаты за право аренды.

Для участия в аукционе необходимо:

- подать заявку установленной формы;
- уплатить задаток на р/с 3012039960017 в отделении ОАО «БПС-Банк» в г. Орша, ул. Комсомольская, 11А, код 304;
- подписать соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставить копии учредительных документов с предъявлением оригинала либо нотариально заверенные.

Заявки на участие принимаются по адресу: г. Орша, ул. Ленина, 221, административное здание ЗАО «Мерком» в рабочие дни с 9.00 до 17.00. В день проведения аукциона заявки не принимаются. **Тел. (0216) 244644.**

УНП 300051735.

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
22 января 2010 года
ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
по продаже изолированного помещения (вспомогательное (подсобное) помещение № 1 Н общей площадью 251,14 кв. м, инвентарный номер 500/D-694957), принадлежащего ОАО «Камволь» и расположенного по адресу: г. Минск, ул. Солнечная, д. 30.

Начальная цена – 682 964 100 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 60 000 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов указана в порядке проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Аукцион состоится **22 января 2010 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 06.01.2010 по 20.01.2010** включительно в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 227 48 36, 227 40 22.

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
10 февраля 2010 года
ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН
по продаже единым лотом имущества УИПЧП «Сивва-М», расположенного по адресу: Минская обл., Логойский р-н, г\п Плещеницы, ул. Партизанская д. 26.
В состав лота входит следующее имущество:

№ п/п	Наименование объекта
1.	Одноэтажный кирпичный материальный склад общей площадью 345,7 кв. м (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, инв. номер 601/С-14226)
2.	Одноэтажная кирпичная проходная общей площадью 9,5 кв. м (здание неустановленного назначение, инв. номер 601/С-14269)

На имущество, входящее в состав лота, обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства.

Имущество, входящее в состав лота, расположено на земельном участке с кадастровым номером 623257500001001557 (присвоен предварительно).

Начальная цена лота – 75 810 060 белорусских рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 7 500 000 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона.

Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Аукцион состоится **10 февраля 2010 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с **10.01.2010 по 08.02.2010** в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефон для справок: (017) 227 40 22. www.mgcn.by.

«ВЕРАСЕНЬ» ВЫЙШАЎ САПРАЎДНЫМ ЦУДАМ У АПОШНІЯ ДНІ 2009 ГОДА

Заўтра прэзентуюць новы літаратурны часопіс

Канцэпцыя новага часопіса — друкаваць пераважна маладых літаратараў, самае лепшае, што выходзіць з-пад іх пяра. Галоўны рэдактар «Верасня» Эдуард Акулін кажа, што ў кожным нумары будуць літаральна па два-тры сталыя творцы — каб захаваць пераемнасць, стварыць школу. Ужо ў першым нумары прадстаўленыя маладыя творцы Віталь Рыжкоў, Наста Кудасава, Настасся Кухарэнка, Воля Чайкоўская, Ігар Канановіч, Лізавета Дамініка Панамарова, Дар'я Ліс, Алена Беланожка, Мюр Фарыдовіч... Побач — жывыя класікі Рыгор Барадулін, Анатоль Вярцінскі, Леанід Дранько-Майсюк...

«Верасень» ужо пачалі параўноўваць з «Дзеясловам» — іншым літаратурным часопісам, які ўжо выходзіць колькі гадоў. Аднак спадар Акулін кажа, што ніхто нікому дарогу не пяройдзе:

— «Верасень» стане выдатнай пляцоўкай для творчай моладзі!

Пакуль што «Верасень» зарэгістраваны з выхадам два разы на год. Аднак спадар Акулін плануе давесці яго да фармату квартальнага часопіса. Маладых літаратараў столькі, што і квартальніка можа не хапіць!

— Ужо ў першым нумары ёсць старонка «Верасок» — для самых юных творцаў, яшчэ са школьнай лавы. А таксама абвешчаны конкурс «Маладыя гады, маладыя жаданні» — на лепшы патрыятычны і лірычны верш. Падвядзенне вынікаў адбудзецца, натуральна, у верасні.

Спадар Акулін кажа, што свае творы ў «Верасень» можа даслаць любы малады творчы чытач «Звязды». Электронны адрас для твораў — verasenchas@gmail.com

А чаму ўсё-такі «Верасень»? — спытаецеся вы.

— Назву выбіраў не я, так часопіс ужо быў зарэгістраваны. Але назва мне падабаецца! Нехта кажа, што гэта восеньская назва, і яна не пасуе да моладзевага выдання... Але ў гэтай назве насамрэч ёсць слова «вера». Гэты часопіс з'явіўся ў засені веры і надзеі на тое, што наша беларуская літаратура ўсё-такі дачакаецца «залацістага, яснага дня» — таго дня, пра які марыў яшчэ Максім Багдановіч, наш самы малады класік.

Заснавальнік часопіса — Таварыства беларускай мовы. Ягоны старшыня, Алег Трусаў, кажа, што выхад часопіса быў пад сур'ёзнай пагрозай.

— Спачатку рэдактарам муселі быць адна маладая дзяўчына, яна ж паспяхова зарэгістравала часопіс. Аднак падрыхтаваць нумар не здолела, склала з сябе паўнамоцтвы. Мы звярнуліся да Эдуарда Акуліна — і ён зрабіў цуд: усяго за месяц зрабіў такі цудоўны першы нумар! Мяркую, што гэта будзе часопіс для моладзі — магчыма, нават для гарадской моладзі. І магу засведчыць, што ўжо першы нумар можна смела ставіць па ўзроўні побач з «Полымем» і «Маладосцю»! Увогуле хачу адзначыць, што часопіс «Верасень» стаў яшчэ адным сведчаннем лібералізацыі дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да беларускай мовы і культуры. У 2009 годзе сапраўды было зроблена даволі шмат, і «Верасень» — адзін з прыкладаў!

Прэзентацыя часопіса «Верасень» з удзелам аўтараў адбудзецца 7 студзеня а 18-й гадзіне ў Чырвоным касцёле ў Мінску (плошча Незалежнасці). Уваход вольны. Першыя 10 гасцей атрымаюць часопіс у падарунак, а першыя 100 асобнікаў будуць прадавацца з калядным дадаткамі — дыскамі Эдуарда Акуліна і Таццяны Беланогай.

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ
РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» проводит 2-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности 11 февраля 2010 года

Лот	Наименование техники	Местонахождение объекта	Год выпуска	Пробег в км/наработка в м/ч, (износ)	Начальная цена продажи (руб.)	Сумма задатка (руб.)
1	2	3	4	5	6	7
22.	Электростанция ЭД2х30/Т400-1РАМ1 № БМ 3658МОИО на КАМАЗ-43101 ш. 0004073 дв. 0483956, 2 кат.	г. Береза в/часть 23324	1989	9227, 415 м/ч	42 000 000	4 200 000
23.	Аэродромная железобетонная плита ПАГ-18, 4 кат.	г. Лида в/часть 19764	1977	–	18 760 000	1 876 000

Аукцион состоится в 11.00 **11 февраля 2010 года** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж.

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в **17.00 9 февраля 2010 г.** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 604.

К участию в аукционе допускаются покупатели, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи 11 февраля 2010 г.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Денежные средства перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018, код 357 в Октябрьском отд. ОАО «БПС Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, УНП 101099370. **Без НДС. Справки по тел.: (017) 224 20 01, факс 224 33 61. Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.com.**

УСМЕШКА НА ФОНЕ ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ СТАНЦЫІ

Расказ аб знаходжанні ў Чарнобыльскіх раёнах Украіны завяршу ўражаннямі ад сустрэч з людзьмі, якія там жывуць. На мой суб'ектыўны погляд, за 23 гады пасля аварыі і 19 — пасля развалу Саюза яны з усяе сілы імкнуцца жыць па «запаведзях»: «Не вер, не бойся, не прасі». Як атрымліваецца? Па-рознаму.

НЕ ВЕР!

Актуальнасць гэтага лозунга для сённяшняй Украіны пры наяўнасці 18 кандыдатаў у прэзідэнты больш чым вялікая. Калі з кожнай сцяны на цябе пазірае велізарны твар якога-небудзь прэтэндэнта, цяжка ўтрымацца і не спытаць ва ўкраінскіх калег: «І на каго стаўку робіце? Хто пераможа?»

Адказ мы атрымлівалі даволі аднолькавы. Самы арыгінальны быў такі: «Даю 50 % за тое, што пераможа або хлопчык, або дзяўчынка».

Асобным з нашых калег, якія не ўваходзяць у штабы па стварэнні іміджу пэўнага кандыдата, нават не цікава, якія ў каго шанцы. Больш за тое, яны не ведаюць прозвішчаў усіх, хто прэтэндуе стаць кіраўніком іх дзяржавы.

Было цікава наглядаць, як на шматлікіх бігбордах, якія ўкраінцы часцяком называць «бігмордамі», выява чарговага прэтэндэнта на вачах змяняецца заклікам падключыцца да «найкращага» хуткаснага інтэрнэту. Украінцы расчараваныя ў палітыцы і палітыках. Чаму? Зусім маладыя мае калегі адказалі так:

— Таму што ведаюць, колькі плацяць за майданы.

— Таму што ведаюць, колькі каштуюць абяцанні палітыкаў.

— Таму што ведаюць, што за палітыкамі стаіць бізнэс са сваімі інтарэсамі.

Не дзіўна, што менавіта на гэтай хвалі ў выбарчых спісах з'явіўся кандыдат з прозвішчам «Василь Противсіх». Гэта не жарт. Сутнасць у тым, что па іх законе іх бюлетэнь насамрэч не прадугледжвае магчымасць прагаласаваць супраць усіх кандыдатаў. А жаданне такое, лічаць тыя, хто робіць PR-кампанію, будзе шмат у каго. На іх і разлічана новае незвычайнае прозвішча грамадзяніна, які змяніў сваё напярэдадні выбарчай кампаніі — для ўдзелу ў ёй.

«Ворог їхньої держави!», «Вона дихає йому в потилицю, йому неприємно» — гэта толькі асобныя з выразаў, якія мільгаюць перад вачыма, калі едзеш па тэрыторыі Украіны. Я магу зразумець украінскую пенсіянерку ў памежнай з Беларуссю вёсцы Чарнігаўскай вобласці, якая на пытанне, за каго яна будзе галасаваць, упэўнена адказвае: «За Бацьку!»

Не вераць украінцы нікому яшчэ і таму, што нават перадвыбарная сітуацыя выступае для іх прыкладам таго, што зноў адбудзецца пасля выбараў: бясконцыя міжусобіцы. Вось і кажуць: усе яны аднолькавыя.

НЕ БОЙСЯ...

Разлік — толькі на свае сілы і магчымасці. А на каго ж яшчэ, калі ва Украіне даўно забылі, напрыклад, пра тое, што такое «калгас». Зямля падзеленая на паі. Іх можна прадаць, купіць... Расказвае **дырэктар Украінскага НДІ сельскагаспадарчай радыялогіі Нацыянальнага ўніверсітэта біярэсурсаў і прыродакарыстання Валерый КАШПАРАЎ**:

— Для чарнобыльскіх раёнаў Украіны характэрная сітуацыя, калі ў 70 % вясковых сем'яў не працуе ніводзін чалавек, у 20 % працуе адзін, і толькі ў астатніх — два і больш працаўнікоў. Калі чалавек мае 2 га зямлі, ён не лічыцца беспрацоўным. Ён вядзе натуральную гаспадарку, штосьці вырошчвае і прадае.

Так што прыватная ініцыятыва тут будзе развівацца — альтэрнатывы ўсё адно няма. Але ж і для яе ўвасаблення на так званых забруджаных тэрыторыях Украіны не вельмі многа магчымасцяў. Нягледзячы на тое, што сучасныя звесткі радыяцыйнага маніторынгу сведчаць: больш за палову ўкраінскіх населеных пунктаў, аднесеных да зонаў радыеактыўнага забруджвання ў 1991 годзе, сёння не маюць патрэбы ў абмежаваннях, звязаных са статусам «зоны», адмяняць яго, тым больш напярэдадні выбараў, ніхто не збіраецца. Згодна ж з асноўным законам Украіны, на гэтых землях нельга будаваць новыя вытворчасці або пашыраць тыя, якія ёсць. Вось і застаецца толькі «купі-прадай».

А калі ўлічыць, што ў апошнія гады сродкі, якія выдзяляюцца з дзяржаўнага бюджэту Украіны на «чарнобыльскія» праграмы, у асноўным накіроўваюцца на сацыяльную абарону розных груп насельніцтва (ад 6 да 30 грыўняў на чалавека), і толькі нязначная сума застаецца для падтрымкі і развіцця мясцовай інфраструктуры (напрыклад, газаправоду, дарог і інш.), «льготны» статус населеных пунктаў украінскай чарнобыльскай зоны можна параўнаць толькі з патэнцыйнымі стратамі, выкліканымі абмежаваннямі «па законе».

Але ж ёсць і «сталкеры», што не баяцца працаваць на землях, якія ў асноўным псіхалагічна зачапіла трагедыя 1986 года. Прыклад — выключэнне з агульнага правіла — прадпрыемства, створанае ў Оўруцкім раёне Жытомірскай вобласці. Пераважна з-за радыяфобіі грыбы і ягады гэтага палескага цэнтра нарыхтоўкі і перапрацоўкі дароў лесу пасля чарнобыльскай аварыі перасталі карыстацца папулярнасцю. Аднак знайшоўся бельгійскі прадпрымальнік, які рызыкнуў купіць мясцовы цэх па перапрацоўцы лясных дароў. Зразумела, пераснасцуў яго поўнасцю, і сёння гэтае прадпрыемства — адзін з найбуйнейшых падаткаплацельшчыкаў у раёне. Штогод адсюль экспартуецца ў краіны Еўрасаюза, пераважна ў Германію, да 500 тон перапрацаваных дзікаросłых грыбоў і ягад.

Як ні распытвала я свайго калегу з Рэпкінскага раёна Чарнігаўскай вобласці, у сваім раёне такіх станоўчых прыкладаў ён успомніць не змог — ніводнага. Гаворыць: з 1991 года глядзім на другі бераг Дняпра, дзе ваш Лоеўскі раён, і зайздросцім.

НЕ ПРАСІ?

— Ну, а калі ў саміх грошай няма, і землі не паўсюль такія ўрадлівыя, як у цэнтральнай Украіне, што рабіць?

Прасіць украінцы навучыліся. Гэта ж таксама няпроста. Бо час гуманітаркі ў выглядзе ношанага адзення, якое адзін жартаўнік, старшыня сельсавета, каб не сварыцца з людзьмі, перакідваў цераз агароджу, прайшоў. Таму сёння калі просяць дапамогу, дык у TACIS, напрыклад.

На бедных землях ва Уладзімірэцкім раёне Ровенскай вобласці з наступнага года будуць вырошчваць клубніцы. Міжнародная арганізацыя выдзеліла мясцовай грамадзе грошы не толькі на элітныя саджанцы, але і прафінансавала стварэнне кансервавага завода, які гарантавана будзе купляць вырашчаную на падворках прадукцыю.

У Іванкаўскім раёне Кіеўскай вобласці на гранты міжнародных арганізацый даўно і даволі паспяхова працуюць сацыяльныя праекты па псіхалагічнай рэабілітацыі мясцовых жыхароў. Пры гэтым прадпрыемствы ў райцэнтры не працуюць увогуле.

Між тым, падобныя праблемы вядомыя і нам, жыхарам Гомельшчыны. Многія кваліфікаваныя спецыялісты ў свой час паехалі з «забруджаных» раёнаў. Прыватныя інвестыцыі дагэтуль не на высокім узроўні ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі. Нягледзячы на тое, што з 1986 года ўзровень радыяцыі ў пацярпелых раёнах знізіўся ў сотні разоў у выніку натуральнага распаду і прымянення неабходных мераў, «дрэнны» імідж канкрэтных раёнаў захаваўся. А палепшыць яго можна толькі канкрэтнымі справамі, у тым ліку па адраджэнні сельскай гаспадаркі.

Вядома ж, галоўную дозавую нагрузку чалавек, які жыве ў «забруджаным» рэгіёне, атрымлівае праз ужыванне малака і іншых прадуктаў харчавання мясцовай вытворчасці. Утрыманне цэзію-137 у малацэ ад розных кароў нават у межах аднаго канкрэтнага населенага пункта можа значна адрознівацца. Гэта звязана з рознымі палеткамі, дзе пасвіцца жывёла, і сенакосамі, дзе мясцовыя жыхары нарыхтоўваюць сена. Найбольшае ўтрыманне цэзію-137 — у малацэ кароў, якія пасвяцца ў пералесках, на пойменных участках, тарфяніках і забалочаных тэрыторыях. Каэфіцыент пераходу радыенуклідаў з травы або сена ў малако і мяса на тарфяных глебах у 100 разоў большы, чым на чарназёмах. Менавіта таму вучоныя раяць абмежаваць выпас на пераўвільготненых тарфяніках і ў лесе, а таксама праводзіць агрэліярацыйныя мерапрыемствы па акультурванні земляў. Што мэтанакіравана і робіцца ў апошнія гады ў Беларусі.

Але не ва Украіне.

Калі мы развітваліся з нашымі ўкраінскімі сябрамі, да мяне падышоў малады калега і сказаў:

— Я заўсёды марыў працаваць у Беларусі. Можа, гэта неяк магчыма? Надакучыла наша ўкраінская нестабільнасць...

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Кіеў — Гомель.

(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 23, 29 і 30 снежня 2009 г.)

У ААТ «МІЖНАРОДНЫ РЭЗЕРВОВЫ БАНК» АДКЛІКАНА ЛІЦЭНЗІЯ

на ажыццяўленне банкаўскай дзейнасці ў частцы правядзення банкаўскіх аперацый па прыцягненні грашовых сродкаў фізічных асобаў ва ўклады (дэпазіты), а таксама па адкрыцці і вядзенні банкаўскіх рахункаў фізічных асобаў, паведаміў карэспандэнту «Звязды» намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі Міхаіл Журавовіч.

Адпаведная пастанова прынята праўленнем галоўнай банкаўскай установы краіны. А падставай для такога рашэння паслужыла тое, што ААТ «Міжнародны рэзервовы банк» не ліквідавала парушэння нарматыву бяспекі функцыянавання ў вызначаны тэрмін. У Нацбанку ўдакладнілі, што, згодна з прадстаўленай справаздачнасцю, зганданае ААТ не мела прыцягнутых сродкаў фізічных асобаў.

Ігар ГРЫШЫН.

НОВЫ ГОД — СЯМЕЙНАЕ СВЯТА?

Першы дзень новага года 32-гадовы жыхар Рагачова сустрэў на бальнічным ложку. Дапамог яму ў гэтым родны бацька, з якім свята і адзначалі. «Падарунак» — удар нажом у жывот, сын запомніць надоўга.

Аналагічны вынік святкавання — у Чачэрску. 1 студзеня ў гадзіну ночы 28-гадовая жанчына пырнула нажом у грудзі свайго 44-гадовага сужыцеля. Нож стаў прычынай сур'ёзных траўмаў яшчэ ў чатырох выпадках высвятлення адносінаў паміж сябрамі і суседзямі падчас святкавання 2010 года, — паведамляюць у прэс-службе Гомельскага УУС. У адной з гэтых сітуацый першы дзень года стаў апошнім днём жыцця 36-гадовага грамадзяніна. Таксама высвятляюцца абставіны падзення з балкона 52-гадовай гамяльчанкі. Па словах яе мужа, яна гэта зрабіла па неасцярожнасці ў стане алкагольнага ап'янення.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

І НА ШЧАНЯТ ПОПЫТ

У беспрацоўнай з вул. Вішнёвая нехта выкраў двух шчанят, якія знаходзіліся ў вальеры пры доме.

Баранавіцкія сышчыкі выйшлі на бамжа, які выкраў тых пародзістых шчанюкоў коштам у 2 млн рублёў, але затрымаць злодзея пакуль што не ўдалося.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.27	16.04	7.37
Віцебск —	8.23	15.47	7.24
Магілёў —	8.17	15.54	7.37
Гомель —	8.05	15.59	7.54
Гродна —	8.41	16.21	7.40
Брэст —	8.33	16.30	7.57

Месяц

Апошняя квадра 7 студзеня. Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Клаўдзіі, Яўгеніі, Мікалая, Сяргея.*

К. *ТРЫ КАРАЛІ (Вадохрышча — Аб'яўленне Пана), Андрэя, Балтазара, Каспара, Мельхіёра.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Лядовы палац ёсць. Будзе і Палац водных відаў спорту

Старшыня Баранавіцкага гарвыканкама Віктар Дзічкоўскі перад Новым годам у Лядовым палацы правёў прэс-канферэнцыю і паведаміў пра вынікі развіцця горада ў 2009 годзе і перспектывы на наступны.

Паводле яго слоў, ужо прынята рашэнне аб будаўніцтве ў Баранавічах яшчэ аднаго спартыўнага комплексу — Палаца водных відаў спорту, які будзе ўзводзіцца побач з Лядовым палацам. Узвядзенне новага комплексу пачнецца ўжо вясной гэтага года. У Баранавічах плануецца адкрыць і хакейнае поле для гульні ў хакей на траве.

Разам з тым, Віктар Іванавіч паведаміў, што ў горадзе 100 км вуліц без асфальту. Каб прывесці іх у парадак, неабходна 250 млрд рублёў, а гэта больш чым бюджэт горада на 2010 год (240 млрд). Складаная сітуацыя і з капітальным рамонтам дамоў. Праблемы назапашваліся дзесяцігоддзямі, і каб адрамантаваць 368 дамоў, патрэбны вялікія грошы — 400 млрд рублёў. Тым не меней, на думку старшыні гарвыканкама, эканамічныя паказчыкі за 2009 год у горада станоўчыя — атрымана 120 млрд прыбытку.

У нядзелю на стадыёне «Лакаматыў» працаваў адкрыты каток — уваход вольны, толькі трэба было ўзяць на пракат канькі. Ахвотных пакатацца хапала. Паехаў у Лядовы палац — і там натоўп, у асноўным моладзь. Выходзіць, што Лядовы палац — запатрабаваны, але ёсць і іншы погляд. Раёнка правяла апытанне, падчас якога жыхар горада, урач па прафесіі, сказаў, што за лепшае было б пабудаваць у горадзе бальніцу. І ў доктара шмат прыхільнікаў. Усё залежыць ад узросту. Тут добра было б вытрымліваць парытэт.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЦЕШЧА МАЯ, ЛАСКАВАЯ...

З Данецка прыехаў да цешчы ў Кармянскі раён 53-гадовы зяць, раней не судзімы пенсіянер, каб... патрабаваць у той грошы. Ён і да гэтага неаднаразова ў лістах звяртаўся да яе з дакучлівымі просьбамі аб матэрыяльнай падтрымцы, а зараз вырашыў здабыць 100 долараў пагрозамі аб гвалце. Заведзена крымінальная справа, паведамляюць у прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

6 студзеня

1494 год — «Вялікае пасольства» вялікага князя літоўскага Аляксандра прыбыло ў Маскву, каб пакласці канец вайне Маскоўскай дзяржавы за так званую «вотчыну» — усходнеславянскія землі, якія ўваходзілі ў склад ВКЛ (вайна працягвалася з 1492 па 1494 год). У выніку складаных перамоў было дасягнута пагадненне аб новай мяжы паміж дзяржавамі. Да Маскоўскай дзяржавы адышло Вяземскае княства і землі ў басейне Верхняй Акі. Вялікае Княства Літоўскае адмовілася ад прэтэнзій на Ноўгарад Вялікі, Пскоў, Цвер, Разань. Пасольства ВКЛ правяло таксама перамовы аб сватаўстве Аляксандра да дачкі Івана III і, атрымаўшы станоўчы адказ, прадстаўляла вялікага князя на заручынах.

1249 год (паводле іншых звестак, у 1272 -м) — князь Міндоўг разграміў каля горада Крутагор'е войска татарскага князя Койдана і з таго часу ў гонар славутай перамогі Крутагор'е стала называцца Койданавам (з 1932 года — горад Дзяржынск).

«Кожны з нас памыляецца».

Петроній Арбітр Гай (3—66), старажытнарымскі пісьменнік.

Дарагі наш **Сяргей Лявонцьевіч КАЗЛОЎСКІ** з г. Мінска. Віншуем цябе **з днём нараджэння**. Моцнага табе здароўя, поспехаў у працы, сямейнага дабрабыту, цяпла, дабра і павагі.

Мы цябе любім. **Родныя.**

Юзэфа СУРКАНТА — перадавіка сельскагаспадарчай вытворчасці віншуем **з днём нараджэння**. Няхай радасць у жыцці прыносяць не толькі поспехі ў працы, але і стасункі з сябрамі.

Віктар і Лена ДУДЗІЧЫ, *г.п. Воранава.*

Усміхнемся!

Двое сяброў пасля святкавання Новага года.

— Прыйшоў дадому на поўным прывадзе...

— Гэта як?

— На карачках...

☺

Гаспадар — госцю:

— Пасвяціць вам на прыступкі?

— Дзякуй, не трэба, я ўжо ўніз ляжу.

☺

А вы ніколі не спрабавалі сушыць галаву міксерам? Валасы атрымліваюцца рэдкія, але кучаравыя!

☺

У гасцях.

— Да чаго ж смачны ў вас боршч! І як вы толькі яго ясце?!

☺

Мужчыны, запомніце: семачкі — гэта не толькі 1-2 кг шалупіння, але і 3-4 гадзіны жаночага маўчання.

☺

— Доктар, у майго мужа адна нага карацейшая за другую, што ж яму рабіць?

— Як што — КУЛЬГАЦЬ!!!

☺

Дзве сяброўкі.

— Мань, а што твой так на цябе глядзіць?

— Ды я яго пасля святкавання Новага года абразіла.

— А як?

— Патэльняй!..

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 8 февраля 2010 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

№№ лотов	Адрес земельного участка	Площадь, га	Срок аренды	Цель использования	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	улица Каштановая в районе жилого дома № 13	0,0016	2 года	размещение торгового объекта по продаже печатных изданий и розничной торговли	740100000002005397	158 000	15 000
№ 2	улица Криулина в районе магазина «Колосок»	0,0013	2 года	размещение торгового объекта по продаже печатных изданий и розничной торговли	740100000002005398	105 000	10 000
№ 3	улица Симонова в районе жилого дома № 18	0,0063	1 год	размещение объекта розничной торговли	740100000005004332	581 000	53 000
№ 4	улица Симонова в районе жилого дома № 19	0,0065	1 год	размещение объекта розничной торговли	740100000005004344	518 000	47 000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

заверенную копию платежного поручения **о внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж);

юридические лица: доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

индивидуальные предприниматели: копию свидетельства о государственной регистрации; копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность;

граждане – копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении **нескольких предметов** аукциона, вносят задаток в размере, установленном для предмета аукциона **с наибольшей начальной ценой.**

1) Условия проведения аукциона (наличие не менее двух участников).

2) Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с предметами аукциона.

3) В течение **10 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельных участков победителям аукциона **оплатить стоимость предмета аукциона**, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков для проведения аукциона. Ориентировочная (общая) сумма затрат (на всех победителей) составляет 8 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206** в рабочие дни с 8.00 до 17.00. **Последний день приема заявлений – 02.02.2010 года до 17.00.**

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

МОГИЛЕВСКИЙ ГОРИСПОЛКОМ СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В г. МОГИЛЕВЕ

Аукцион состоится 20 января 2010 года в 16.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, зал заседаний

№№ лотов	Адрес земельного участка	Площадь, га	Срок аренды	Целевое назначение	Условия продажи, размер убытков	Сведения об инженерных коммуникациях	Кадастровый номер	Начальная цена (руб.)	Сумма задатка (руб.)
№ 1	улица Гагарина (ограничения в использовании – водоохранная зона р. Днепр)	5,8309	50 лет	строительство и обслуживание гипермаркета	право вырубки дикорастущей древесно-кустарниковой растительности, снос капитальных строений в границах земельных участков и возмещение ГКПУП «Могилевремстроймонтаж» убытков в размере 1 588 702 000 рублей	на земельном участке имеется водопровод, линия электропередачи до 1000 вольт	740100000005003914	4357410000	392167000
№ 2	улица Ленинская	0,3054	50 лет	строительство и обслуживание многофункционального комплекса офисно-коммерческих, торговых сооружений с объектами сферы обслуживания	снос объектов недвижимости и возмещение МГКУП «Горсвет» убытков в размере 788 540 187 рублей	на земельном участке имеется водопровод	740100000004000200	393898000	35451000
№ 3	улица Габровская	0,2697	50 лет	строительство и обслуживание административно-складской базы			740100000005003822	60261000	5423000
№ 4	улица Первомайская (р-н жилого дома № 72)	0,0828	50 лет	строительство и обслуживание административно-торгового здания с гостиничными номерами и кафе			740100000003005439	94927000	8543000
№ 5	улица Ямницкая, (ограничения в использовании на площади 0,0562 га – охр. зона ЛЭП)	0,0800	50 лет	строительство и обслуживание складских помещений			740100000003005397	21922000	1973000
№ 6	бульвар Непокоренных (р-н жилого дома № 76)	0,0011	до 1.06.2010	размещение объекта розничной торговли			740100000005004131	85000	8000
№ 7	улица Фатина, ост. «Ново-строевская» (от центра)	0,0021	до 1.06.2010	установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне			740100000006002441	105000	9000
№ 8	ул. Криулина (р-н жилого дома № 10)	0,0026	до 1.06.2010	установка и обслуживание торгового павильона			740100000002005159	112000	10000
№ 9	пр-кт Димитрова, ост. «Пр-кт Димитрова» (от центра)	0,0010	до 1.06.2010	установка и обслуживание торгового киоска в остановочном павильоне (№ 2)			740100000007004793	43000	4000
№ 10	улица Турова (р-н жилого дома № 3)	0,0074	до 1.06.2010	размещение объекта розничной торговли			740100000002005306	346000	31000
№ 11	пр-кт Витебский, ост. «Автозавод им. С.М. Кирова» (от центра)	0,0012	до 1.06.2010	установка и обслуживание торгового киоска (№ 2) в остановочном павильоне			740100000007004847	28000	3000

Принимать участие в аукционе могут юридические лица, индивидуальные предприниматели и граждане.

При оформлении заявления и соглашения о правах и обязанностях сторон желающие принять участие в аукционе представляют:

заверенную копию платежного поручения **о внесении задатка** на расчетный счет Могилевского городского исполнительного комитета № 3642017441709 в филиале 700 МОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700123787 (разовый платеж);

юридические лица: доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица; документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

индивидуальные предприниматели: копию свидетельства о государственной регистрации; копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность;

граждане – копию паспорта, а в случае участия в аукционе представителя – копию паспорта и нотариально удостоверенную доверенность;

иностранные юридические лица: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения, также документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе), либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованными в установленном порядке переводами на белорусский (русский) язык;

представители иностранного юридического лица или гражданина: легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

Граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких предметов аукциона, вносят **задаток** в размере, установленном для предмета аукциона **с наибольшей начальной ценой.**

1) Условия проведения аукциона (наличие не менее двух участников).

2) Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с предметами аукциона.

3) В течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении в аренду земельных участков победителям аукциона оплатить стоимость предмета аукциона, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решениях об изъятии земельных участков для проведения аукционов. Ориентировочная (общая) сумма расходов составляет 20 миллионов рублей.

Заявления и документы принимаются уполномоченной организацией (МГУКПП «Проектное специализированное бюро») по адресу: **г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 206 в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Последний день приема заявлений – 15.01.2010 года до 17.00.**

Контактный телефон в г. Могилеве 22 11 63.

Усім, хто мае звесткі пра **Крыжаноўскага Аляксандра Аркадзьевіча**, 12 красавіка 1955 года нараджэння, ураджэнца г. Віцебска, апошняе вядомае месца жыхарства: г. Віцебск, пр-т Фрунзэ, д. 26, корп. 1, кв. 28, просьба паведаміць іх **суду Кастрычніцкага раёна г. Віцебска** на адрас: г. Віцебск, вул. Праўды, 34, каб. 3.9 суддзі Закрэўскай І.О.

Усім, хто мае звесткі пра **Пукаву Ірыну Фёдараўну**, 18 мая 1975 года нараджэння, ураджэнку г. Віцебска, апошняе вядомае месца жыхарства: г. Віцебск, вул. Гагарына, 31—54, просьба паведаміць іх **суду Кастрычніцкага раёна г. Віцебска** на адрас: г. Віцебск, вул. Праўды, 34, каб. 3.9 суддзі Закрэўскай І.О.

Усім, хто мае звесткі пра **Голубеву Галіну Віктараўну**, 06.09.1963 года нараджэння, ураджэнку Мінскай вобласці Мядзельскага раёна, в. Ставішова, апошняе вядомае месца жыхарства: г. Віцебск, вул. 4-я Лінія, д. 68, просьба паведаміць іх **суду Кастрычніцкага раёна г. Віцебска** на адрас: г. Віцебск, вул. Праўды, 34, каб. 3.9 суддзі Закрэўскай І.О.

У **суд Кастрычніцкага раёна г. Віцебска** паступіла заява аб аб'яўленні памерлай **Бабіч Настассі Сцяпанаўны**, 23.10.1982 года нараджэння, ураджэнкі г. Віцебска, апошняе вядомае месца жыхарства: г. Віцебск, вул. Гагарына, 27—59. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Бабіч Настассю Сцяпанаўну, паведаміць аб гэтым на працягу двух месяцаў з моманту апублікавання паведамлення **суду Кастрычніцкага раёна г. Віцебска** на адрас: г. Віцебск, вул. Праўды, 34, каб. 3.3 суддзі Барковай М.В.

Свята-Уваскрасенская царква — сапраўднае ўпрыгажэнне Брэста.

АДРАДЖЭННЕ ВЁСКІ ПАЧЫНАЕЦЦА З ПРАЕКТА

Дзяржаўнае ўнітарнае праектна-пошукавае прадпрыемства «Інстытут «Брэстбудпраект» у хуткім часе будзе адзначаць свой 50-гадовы юбілей. Маючы вялікі вопыт праектавання, прадпрыемства выконвае заказы ўсіх узроўняў складанасці. Задачы, над вырашэннем якіх інстытут працуе сёння, — забеспячэнне выканання дзяржаўных інавацыйных праграм, узвядзенне жылых дамоў у вёсцы, шматкватэрных жылых дамоў з дзяржаўнай падтрымкай, праектаванне аб'ектаў Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь у Пружанскім, Пінскім і Брэсцкім раёнах, комплексу па вытворчасці свініны ля вёскі Востраў у Ляхавіцкім раёне (ЗААТ «Белдан»), вялікай колькасці кацельняў і аб'ектаў газазабеспячэння. У год тут выпускаецца праектнай дакументацыі на 10 мільярдаў рублёў! Унітарнае прадпрыемства «Інстытут «Брэстбудпраект» стабільна трымаецца на рынку, забяспечвае эфектыўнасць працы і атрыманне прыбытку. Штогод аб'ём прадукцыі, якая вырабляецца на прадпрыемстве, павялічваецца на 20—30 працэнтаў.

Дырэктар інстытута Віктар БЛІНКОЎ.

На жаль, падліку, колькі ўсяго зроблена арганізацыяй за амаль паўстагоддзя, што дзейнічае інстытут, не вялося, але ў кожным раёне Брэсцкай вобласці і самім абласным цэнтры ёсць жылыя, вытворчыя будынкі, аўтарамі якіх з'яўляюцца спецыялісты «Брэстбудпраекта». Напрыклад, у інстытуце нарадзіліся праекты прамысловых прадпрыемстваў «Санта», «Інка», свабоднай эканамічнай зоны «Брэст», завода па ўтылізацыі адходаў ля Бярозы, дамоў культуры ў Пружанах і Кобрыне, дзіцячага аздараўленчага цэнтра «Колас» у Кобрынскім раёне, аб'ектаў культавага прызначэння (мужчынскага манастыра ў вёсцы Аркадыя і Свята-Уваскрасенскай царквы ў абласным цэнтры, за якую царкоўныя служыцелі падарылі інстытуту абраз), рэканструкцыі басейна ў Бярозе і шмат іншых. Але ў апошнія гады асноўная спецыялізацыя інстытута «Брэстбудпраект» — гэта аб'екты ў вёсцы: малочнатаварныя фермы, птушкафабрыкі, свінакомплексы, зернесушылкі, і, зразумела, жыллё.

Так, дзяржаўным унітарным праектна-пошукавым прадпрыемствам «Інстытут «Брэстбудпраект» запраектавана птушкафабрыка ў Тамашоўцы — адным з найпрыгажэйшых узорных аграгарадкоў, дзе створана выдатная інфраструктура, з крамамі, кавярняй, рэстаранам, школай, басейнам, фізкультурным комплексам і нават музеем касманаўтыкі. Будаўніцтва птушкафабрыкі знаходзіцца на завяршальнай стадыі.

— За апошнія тры гады мы запраектавалі каля 40 новых малочнатаварных фермаў па Брэсцкай вобласці, — расказвае дырэктар інстытута Віктар БЛІНКОЎ. — На сучасных фермах будзе не толькі вырабляцца прадукцыя, але і ўзнаўляцца пагалоўе. Кароўнік цяпер — гэта будынак шырынёй 30—33 метры без падоўжных сцен, толькі на метр ідзе абгароджвальная канструкцыя і тарцовыя сцены. Па новых тэхналогіях карова павінна стаяць на адкрытым паветры, а каб яна не хварэла, неабходна, каб у памяшканні было суха. Мы пераймаем замежныя тэхналогіі. Новыя беларускія фермы робяцца не горшымі, чым у Галандыі, Даніі, Германіі, Ізраілі, Канадзе.

ЗАМЕЖНЫМ ТЭХНАЛОГІЯМ — БЕЛАРУСКУЮ «ВОПРАТКУ»

Паступова заходнія тэхналогіі пачынаюць прыжывацца на беларускай глебе, задача інстытута — адаптаваць іх да нашых умоў, клімату. Запраектаваны «Брэстбудпраектам» новы свінакомплекс па адкорме свіней у складзе рэпрадукцыйнай і адкормачнай фермаў пры вёсцы Востраў Ляхавіцкага раёна (заказчыкам якога выступае замежнае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Белдан»), які наведаў Прэзідэнт Беларусі, лічыцца адным з лепшых у рэспубліцы. Упершыню ў Беларусі пры ўзвядзенні свінакомплексу былі распрацаваныя новыя праектныя рашэнні з прымяненнем сучасных тэхналогій вырошчвання жывёл. Цяпер свінкі будуць вырошчвацца па дацкіх тэхналогіях.

— Сучасны свінакомплекс — прадпрыемства, на якім людзям прыемна і зручна працаваць. Гэта замкнёны цыкл, дзе ў комплексе вырашаюцца пытанні як вытворчасці, так і перапрацоўкі, дзе ўсё прадумана да дробязяў. Ажно да таго, што адходы вытворчасці, стокі знаходзяць сваё прымяненне. Заходнія тэхналогіі мы «апранаем» ў нашы будынкі. Прынамсі, самі датчане заўважаюць, што яны не бачылі лепшых канструкцый, чым нашы. Беларускія будынкі з паўрам у адрозненне ад іх часовых, робяцца трывала ў жалезабетоне. Акрамя замежных тэхналогій мы імкнёмся ў гэтыя аб'екты ўкладаць сваю душу. Безумоўна, хочацца прыдаць гэтым будынкам і адпаведнае знешняе аблічча, — расказвае кіраўнік архітэктурна-праектнай групы першага аддзела комплекснага праектавання Анатоль ГУЛЯКА. — Зараз наш аддзел у асноўным працуе па Пружанскім раёне (які ў адпаведнасці з указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь прызнаны базавай гаспадаркай Беларусі па вытворчасці малочнатаварнай прадукцыі). У гэты час працуем над праектамі малочнатаварных ферм у вёсках Мурава, Калядзічы, Хвалава, Сухапаль і іншых Пружанскага раёна, свінакомплексаў у вёсках Бор-ліпы, Казлы, Клятное Пружанскага раёна і ў вёсцы Сычова Жабінкаўскага раёна. Адпаведна да іх ствараем праекты камбікормавых заводаў і зернесушыльных комплексаў.

Сярод аб'ектаў, у якія «ўкладзена душа» архітэктараў другога аддзела комплекснага праектавання, — птушкафабрыка гаспадаркі ААТ «Камароўка».

Птушкафабрыка па вырошчванні і адкорме 5776 мільёнаў куранят-бройлераў у год пры вёсцы Прыбарава займае вялізную тэрыторыю ў 39,5 гектара. Супрацоўнікі інстытута, якія распрацоўвалі гэты комплекс, расказваюць, што сёння, пасля таго, як першая чарга ўведзена ў строй, патрапіць у птушыныя цэхі складаней, чым на які-небудзь сакрэтны аб'ект, настолькі там жорсткая санітарыя. На гэтым складаным комплексе будзе ажыццяўляцца закрыты цыкл ад вырошчвання куранят з яек да пэўнай вагі і да разбірання тушак, перапрацоўкі іх у гатовыя мясныя вырабы. Тут будзе нават свая фірмовая крама.

Цяпер рыхтуецца праект камбікормавага завода на базе гэтага ж аб'яднання ў вёсцы Прыбарава. Дарэчы, праект птушкафабрыкі інстытут «Брэстбудпраект» выстаўляў на Міжнародным фестывалі архітэктуры ў 2009 годзе.

— Усе будынкі комплексу птушкафабрыкі — індывідуальная распрацоўка. У цэху інкубацыі кураняты будуць вырошчвацца па бельгійскай тэхналогіі. Створаны вялікія цэхі па забоі птушкі і яе перапрацоўцы, лабараторыя, дэзбар'еры. Прыгожа выкананы адміністрацыйны будынак, уваходныя групы зроблены ў выглядзе пірамід. Гэты буйны аб'ект мы праектавалі два гады, а да таго была праведзена сур'ёзная азнаямляльная праца. Мы ездзілі ў камандзіроўкі ў Расію, ва Украіну і ў Польшчу, вывучалі іх вопыт, — расказвае кіраўнік другога аддзела комплекснага праектавання Віктар ФЯДЫНІЧ.

Другі аддзел комплекснага праектавання «шэфствуе» над Брэсцкім, Драгічынскім, Каменецкім, Пінскім і Маларыцкім раёнамі. Апошні, дарэчы, шмат у чым сваім сучасным абліччам абавязаны інстытуту «Брэстбудпраект».

Праект рэканструкцыі Дома культуры ў Кобрыне.

У Маларыце шмат кварталаў з жылымі дамамі, якія ствараліся супрацоўнікамі інстытута. Напрыклад, для вуліцы Маякоўскага ў Маларыце распрацаваны дамы на 32, 36, 40 і 60 кватэр. Па распрацоўках «Брэстбудпраекта» ствараліся і жыллё на вуліцах Школьная, Чкалава і Лермантава. А адны з самых прыгожых шматкватэрных дамоў Маларыты, запраектаваныя інстытутам, з'явіліся на вуліцы Паркавай.

— Гэта індывідуальныя распрацоўкі, кавае жыллё. Эканамічнае жыллё ў вёсцы — таксама наша дзецішча.

Сярод нашых аб'ектаў: малочнатаварная ферма «Дворышча» (гэту гаспадарку мы стваралі для фірмы «Савушкін прадукт»). Узорна-паказальная ферма «Чарнаўчыцы», на прыёмку якой прыязджаў Прэзідэнт, таксама рабілася па нашым праекце, прынамсі, яна адна з першых створана ў драўляных канструкцыях. Шмат у нас аб'ектаў: узнімаем райцэнтры, малыя гарады і сельскую гаспадарку.

Калектыў архітэктурнай групы другога аддзела комплекснага праектавання і яе кіраўнік Ірына ЛІФАНАВА (у цэнтры).

Намеснік дырэктара інстытута Уладзімір АБРАЗЦОЎ.

Калектывам інстытута была праведзена сур'ёзная праца па праектаванні птушкафабрыкі гаспадаркі ААТ «Камароўка».

УТУЛЬНА, ПРЫГОЖА, ЗРУЧНА

Пра жыллё ў вёсцы, што ствараецца па праектах інстытута «Брэстбудпраект», кажуць, што лепшае яшчэ пашукаць трэба. Некаторым вяскоўцам і гараджане пазайздросціць могуць, бо так у іх катэджах утульна, камфортна. Гаспадарам сучаснага жылля ў вёсцы не трэба бегаць па ваду да калодзежа, яна праведзена ў дом, гэтак жа як і газ. На Брэстчыне будуюцца адны з самых прыгожых аграгарадкоў. Тут умеюць чараваць над іх абліччам. Брэсцкая вобласць багата на архітэктараў, выпускнікі Брэсцкага тэхнічнага ўніверсітэта імкнуліся асесці тут.

Пра сучаснае жыллё ў вёсцы мы пацікавіліся ў галоўнага архітэктара інстытута «Брэстбудпраект», члена Саюза архітэктараў з дваццацігадовым стажам Мікалая АЛЕКСЕЮКА.

— Сёння мы пераважна працуем для сельскай мясцовасці над катэджнай забудовай. Сучасныя дамкі добраўпарадкаваныя, яны падключаны да інжынерных камунікацый, — расказвае Мікалай Рыгоравіч. — Калі раней мы праектавалі двухпавярховыя дамы, зараз працуем над аднапавярховымі. У такіх у вёсцы жыць прасцей. Прычым гэтыя дамы будуюцца з магчымасцю прыстройвання мансардаў (гэта прастора, якую ў перспектыве можна выкарыстоўваць пад жыллё). Кроквенныя сістэмы выкананы такім чынам, каб у гаспадара будынка, калі яго сям'я будзе разрастацца, была магчымасць пашырыцца — дабудоўваць жылыя памяшканні.

У новых дамах на нарматывах кухня павінна быць не меншая за 9 метраў. Мы імкнёмся праектаваць яе з двума ўваходамі — асноўным і гаспадарчым. Топачная ў катэджы можа быць на газу ці цвёрдым паліве. Яна служыць адначасова і гардэробнай, дзе вясковец можа зняць брудныя боты і пакінуць працоўную вопратку, памыцца і пераапрануцца. Санвузлы робяцца такімі, каб там магчыма было размясціць ванну, ракавіну і пральную машыну. Туалет і ванная робяцца асобна.

З гэтага года дамы будуць здавацца з унутранай апрацоўкай (у жылых памяшканнях — гэта фарбаванне і абклейванне шпалерамі, у санвузле і кухні — абліцоўка пліткай).

Для аграгарадкоў праектуем дамкі, каб яны адрозніваліся адзін ад аднаго. Робім рознае каляровае вырашэнне ў фарбаванні дамоў. Перавагу аддаём пасцельнай гаме, таму што кантрасныя колеры выгараюць. Імкнёмся адыходзіць ад «мокрых працэсаў» (штукатурных работ). Лепш, каб абліцовачныя матэрыялы былі натуральнымі (напрыклад, як цэгла). Маё меркаванне: малыя дамы не трэба рабіць празмерна вычварнымі. Добры дах, не абавязкова ламаны, нават і прамы здольны прыдаць належны выгляд будынку. Галоўнае, каб будаўніцтва было якаснае.

— З кожным годам дамы становяцца больш камфортнымі, — заўважае дырэктар інстытута Віктар Блінкоў. — Цяпер наша дзяржава пераходзіць на еўрастандарты, мяняюцца цеплатэхнічныя нормы, сцены будуць лепш трымаць цяпло, на абагрэў новых дамоў патрабуецца менш энергарэсурсаў. Мы пачалі супрацоўнічаць з фірмамі па ўсталяванні сучасных эканамічных сістэм ацяплення і кандыцыянавання. Гаспадар жылля зможа задаваць у сваёй кватэры не толькі пэўную тэмпературу, але і вільготнасць паветра.

КАДРЫ

Сёння ў дзяржаўным унітарным праектна-пошукавым прадпрыемстве «Інстытут «Брэстбудпраект» працуе 335 чалавек. Старэйшыя супрацоўнікі — гэта залаты фонд прадпрыемства. У дзевяностых гадах перажыўшы, як і ўсе праектныя інстытуты рэспублікі, хвалю масавых скарачэнняў, тут змаглі захаваць найлепшых спецыялістаў. З 2001 года інстытут пачаў нарошчваць кадры, тут сталі набіраць па 20—30 чалавек на год, у асноўным маладых спецыялістаў. Прадпрыемства актыўна супрацоўнічае з навучальнымі ўстановамі, там прыглядае сабе кадры, студэнты запрашаюцца на практыку.

З маладымі спецыялістамі вядзецца актыўная праца, тут яны набываюць каштоўныя веды. Першыя гады працы ў інстытуце моладзь можа параўнаць з атрыманнем яшчэ адной вышэйшай адукацыі. Супрацоўнікі інстытута ўдзельнічаюць у разнастайных выставах, семінарах, пастаянна павышаюць кваліфікацыю. Можа таму прыватныя структуры і імкнуцца пераманіваць адсюль спецыялістаў.

Найпершыя памочнікі дырэктара — галоўны інжынер інстытута Аляксандр Мельнік, галоўны архітэктар Мікалай Алексяюк, кіраўнік групы тэхнолагаў Аляксандр Шчэрба, тэхнічны аддзел узначальвае галоўны канструктар Анатоль Грыцюленка. Сярод вядучых спецыялістаў, якіх хацелася б адзначыць: па водазабеспячэнні і каналізацыі Таісія Баярынцава, па ацяпленні і вентыляцыі Мікалай Новік, па электразабеспячэнні і аўтаматызацыі Васіль Кузаўко, па газазабеспячэнні і абароне газаправодаў Уладзімір Грыцук, па кацельнай гаспадарцы Анатоль Рагожын. Сярод больш маладых спецыялістаў заслугоўваюць увагі спецыяліст па канструктарскай частцы Анатоль Петрачук, кіраўнік архітэктурна-канструктарскай групы Ігар Петруковіч, кіраўнік групы ацяплення і вентыляцыі Жанна Пыкавая, кіраўнік групы газазабеспячэння Ніна Масіянчык. Тут склаўся дружны калектыў. І, між іншым, супрацоўнікі «Брэстбудпраекта» падтрымліваюць сябе ў добрай фізічнай форме (у гарадской спартакіядзе займаюць прызавыя месцы па настольным тэнісе, дартсе, міні-футболе і плаванні). Часам яны выбіраюцца ў турыстычныя паездкі па Беларусі і за яе межы, у планах — адрадзіць базу адпачынку на возеры Любань.

Дзіцячы рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр «Колас» у Кобрынскім раёне.

Галоўны архітэктар «Брэстбудпраекта» Мікалай АЛЕКСЯЮК.

ПРАЕКТНАЯ КУХНЯ

Намеснік дырэктара інстытута «Брэстбудпраект», кандыдат тэхнічных навук Уладзімір АБРАЗЦОЎ праводзіць нас па ўстанове, знаёміць з рознымі службамі і раскрывае некаторыя сакрэты складаной праектнай кухні. Наколькі камфортна людзям будзе жыць у доме, кватэры, працаваць на тым ці іншым прадпрыемстве, шмат у чым залежыць менавіта ад прафесіяналізму супрацоўнікаў праектнай арганізацыі. Перш чым пачнецца будаўніцтва аб'екта, над яго стварэннем працуе вялікая колькасць людзей. Тут вырашаецца ўсё: ад таго, як будынак размесціцца на пэўнай тэрыторыі, да таго, якога ён будзе колеру і з якіх матэрыялаў яго ўзводзіць, пралічваюцца каштарысы.

А пачынаецца ўсё з геолага-геадэзічных пошукаў. У геадэзічнай службы «Брэстбудпраекта» ёсць усе ліцэнзіі на правядзенне пошукавых і геалагічных работ, інстытут мае тры буравыя ўстаноўкі, ёсць уласныя майстэрні і гараж, свая акрэдытаваная лабараторыя грунтоў. Дарэчы, інстытут пастаянна ўдасканальвае тэхналогіі вытворчасці, тут прымяняюцца найноўшыя распрацоўкі і абсталяванне.

Праца над будучай фермай, прадпрыемствам, домам пачынаецца з чыстага поля, куды выязджаюць геадэзісты, яны робяць здымку, праводзяць пошукі, ідзе выбар пляцоўкі, робіцца разбіўка і прывязка аб'екта.

У лабараторыі грунтоў выпускаецца поўная геалогія, па якой разлічваюцца фундаменты. Далей падключаюцца канструктары, архітэктары, вырашаюцца пытанні з ацяпленнем, каналізацыяй, газазабеспячэннем, вентыляцыяй, электрычнасцю. Далей ідзе экспертыза праектаў і каштарысаў, экалагічная экспертыза. На завяршальным этапе аддзел выпуску, калі іншае не агаворана кантрактам, стварае не менш за пяць экзэмпляраў гатовага праекта.

Тэхнічны аддзел сумесна з галоўным інжынерам інстытута вызначаюць тэхнічную палітыку праектаў, што распрацоўваюцца. Усе змяненні і папраўкі ў нарматыўна-прававых актах адразу фіксуюцца ў інстытуце, штомесяц ідзе абнаўленне фондаў тэхнічна-нарматыўных прававых актаў.

Аддзел спецработ займаецца праектаваннем кацельных установак на ўсіх відах паліва, магістральных сетак газазабеспячэння.

— А як вы перажываеце крызіс? — пытаюся ў намесніка дырэктара Леаніда КУХАРЧЫКА.

— А мы яго не адчулі, наш інстытут вельмі запатрабаваны, у нас працы шмат, — заўважае Леанід Вікенцьевіч. — Заказаў у праектны інстытут паступае столькі, што можна было б смела павялічваць калектыў, але не хапае памяшканняў, дзе размясціць людзей. На працягу больш дзесяці гадоў інстытут забяспечвае выкананне ўсіх тэхніка-эканамічных паказчыкаў, заробак выплочваецца два разы ў месяц у вызначаныя калектыўным дагаворам тэрміны. У напружаным графіку працуе і філіял інстытута «Брэстбудпраект», які адкрыты ў Століне.

Напрыклад, вялікі фронт работ у аддзела, які займаецца ацэнкай тэхнічнага стану і абследаваннем будаўнічых канструкцый будынкаў і збудаванняў.

— Як толькі справа датычыцца рэканструкцыі, найперш трэба даследаваць будынак на прыдатнасць апорных канструкцый, паглядзець ацяпленне, вентыляцыю і гэтак далей. І, зразумела, рабіць праект рэканструкцыі. Часам спецыялістам даводзіцца працаваць і ў небяспечных умовах, вы толькі паглядзіце, з якімі аб'ектамі ім даводзіцца мець справу, — намеснік дырэктара Уладзімір Абразцоў просіць паказаць нам здымкі збудаванняў, якія чакаюць рэканструкцыі. — Мяркую, што гэты кірунак дзейнасці будзе пашырацца, прычым даволі істотна, ужо зараз мы вымушаны адмаўляць у некаторых заказах, так іх шмат.

Асноўныя заказчыкі «Брэстбудпраекта» — дзяржаўныя ўстановы, дзякуючы яго напрацоўкам ствараюцца аб'екты ў межах разнастайных дзяржаўных праграм. Напрыклад, амаль уся праектная работа па газазабеспячэнні выканана супрацоўнікамі гэтага інстытута. І столькі жылля для вёскі на Брэстчыне не праектуе ніхто іншы. А яшчэ яго паслугамі карыстаюцца вядучыя прамысловыя прадпрыемствы.

Сёння ў будынках, спраектаваных дзяржаўным унітарным праектна-пошукавым прадпрыемствам «Інстытут «Брэстбудпраект» і ўжо пабудаваных, працуюць калектывы такіх буйных прадпрыемстваў, як «Санта-Брэмар», «Інка-Фуд», «Еўра-Трэйд», Целяханскі завод сталярных вырабаў, Івацэвіцкі завод жалезабетонных вырабаў, праведзена рэканструкцыя завода будматэрыялаў у Бярозе.

Сучаснае жыллё ў вёсцы з кожным годам становіцца больш камфортным.

Публікацыю падрыхтавалі Алена ДЗЯДЗЮЛЯ і Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ. Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ і з архіва прадпрыемства.

Ліцэнзія № 02250/0463143 сапраўдная да 02.07.2013 г. УНП 200127288.

Начальнік групы камплектацыі і выпуску праектаў Таццяна СВІРСКАЯ (злева), тэхнікі Тамара МАРУШКА і Марына ЧВЫРОВА.

Кіраўнік архітэктурнай групы першага аддзела комплекснага праектавання Анатоль ГУЛЯКА.

Група геадэзіі дэманструе электронны тахіёметр, які дазваляе значна палепшыць якасць і скараціць час выканання праектна-каштарыснай дакументацыі. Начальнік аддзела пошуку Аляксандр НАВУМАВЕЦ (справа), тэхнік Алена БАБУРА і інжынер Павел КУХАРЧЫК.

ПАНЯДЗЕЛАК, 11 СТУДЗЕНЯ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
6.05, 7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 18.50, 01.55 Зона Х.
7.30, 8.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.30 У свеце матораў.
09.10 Nota Bene.
9.40 Здароўе.
10.05 Жаночае ток-шоу «Жыццё як жыццё».
11.05, 17.25 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
12.10 Кінааповесць «Вялікая сям'я».
14.05 Дак. цыкл «Мая праўда». «Дана Барысава».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 Дак. цыкл «Нябачны фронт».
15.55 Культурныя людзі.
16.25 Серыял «Сёстры па крыві».
18.25 «Лёгка сказаць». Відэафільм АТН.
19.30 «Арэна».
19.55 Ток-шоу «Ход у адказ».
21.00 Панарама.
21.50 «Гульні ўсе ўзросты пакорныя».
22.05 Трылер «Другое дыханне».
1.00 Серыял «Часткі цела-5». 1-я серыя.
2.00 Дзень спорту.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.15, 1.15 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.10 Тэорыя неверагоднасці. «Паміж мінулым і будучыняй пра сучаснае».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.30, 1.30 Навіны спорту.
11.10 «Рэкламная паўза».
12.00 «Малахаў+».
13.10 «Зразумець. Дараваць».
13.40 «Модны прыгавор».
14.45 «Кантрольная закупка».
15.15 Серыял «Аматарка прыватнага вышуку Даша Васільева».
16.15 Серыял «Монтэкрыста».
18.20 Серыял «Мая цудоўная нянька».
19.05 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.05 «Уладзімір Мулявін. Нараджэнне легенды».
23.35 «На ноч гледзячы».
